«КУЛЬТУРА» НА ХВАЛІ КАШТОЎНАСЦЯЎ

9

АКЦЭНТ – НА ПАВАГУ ДА НАСТАЎНІКА

19

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 СТУДЗЕНЯ 2022 г.
ПЯТНІЦА
№ 8 (29630)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

КАРАТКА

• **У Мінскім планетарыі пройдзе Тыдзень астраноміі з удзелам расійскіх вучоных.**

• Прадстаўнікі МАЗ павіншавалі з навагоднімі святамі пацыентаў дзіцячай бальніцы № 4 Мінска.

• **Выстаўка «Беларускі будаўнічы тыдзень» пройдзе ў Мінску 20—22 красавіка.**

• «Белавія» аднаўляе рэйсы ў Алматы з 15 студзеня.

• **Амаль 40 мастоў і пуцеправодаў адрамантавалі ў Мінскай вобласці за тры гады.**

• Памёр намеснік старшыні Беларускай федэрацыі баскетбола Уладзімір Расека.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір АРЧАКОЎ, намеснік дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі:

«У нашай краіны няпростая гісторыя. Знаходзячыся на геапалітычным разломе еўрапейскай прасторы, яна ўвесь час адчувала ўсебаковы цывілізацыйны ціск. Аднак, нягледзячы на шматлікія войны, палітычныя і эканамічныя ўзрушэнні, беларускі народ выдужаў, не знік з твару зямлі, захаваў традыцыі і духоўна-культурныя каштоўнасці, абараніў права на самастойнае развіццё. Менавіта нацыянальная самабытнасць стала аб'ектыўным фактарам таго, што Беларусь ніколі ў гісторыі не была ні залежнай тэрыторыяй, ні тым больш калоніяй. Для Беларусі цяперашні этап станаўлення як маладой суверэннай дзяржавы шмат у чым залежыць ад рэалізацыі ўласных нацыянальных канцэптаў».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Пры любых навацыях павінна быць забяспечана бесперабойнасць працэсаў у гаспадарчай дзейнасці»

Прэзідэнт на нарадзе з урадам абмеркавалі пытанні, якія патрабуюць вырашэння

На першую ў гэтым годзе нараду з урадам вынесены пытанні, якія патрабуюць абмеркавання ў шырокім складзе. Сярод іх — праекты рашэнняў па ўдасканаленні сістэмы закупак, кіраванні маёмасцю сумеснага домаўладання, павышэнні ўзроўню фінансавай адукаванасці насельніцтва і стварэнне новага дзяржаўнага органа — Міністэрства лічбавага развіцця і сувязі. Па словах Прэзідэнта, нараду ён сабраў, каб усебакова разабрацца, ці дазволяць прапанаваныя на разгляд дакументы вырашыць наяўныя праблемы і якія наступствы можна чакаць.

Фота БелТА.

ВЫКЛЮЧЫЦЬ «ШЭРЫЯ СХЕМЫ» І ПАСРЭДНІЦТВА

Першае пытанне пасяджэння датычылася сістэмы закупак. Паводле кіраўніка краіны, яна заўсёды была аб'ектам яго пільнай увагі, паколькі з'яўляецца адным са значных інструментаў эканамічнай палітыкі.

СТАР. 2

Па палічках

ЗАПЛАЦІ ПАДАТКІ І СПІ СПАКОЙНА

Дакументы аб сваіх гадавых даходах асобныя падаткаплацельшчыкі павінны накіраваць у інспекцыю не пазней за 31 сакавіка

Хто павінен прадставіць падатковую дэкларацыю за 2021 год і заплаціць падаходны падатак? Якія неабходна дэкларараваць даходы? Якія льготы прадугледжаны для розных катэгорый грамадзян? І якімі спосабамі прадстаўленне дэкларацыі і выплаты падаходнага падатку можна цяпер скарыстацца? На гэтыя актуальныя пытанні мы паспрабавалі адказаць сумесна з прадстаўнікамі прэс-службы Міністэрства па падатках і зборах.

Пытанні пастаяннага месцазнаходжання лепш удакладніць загадзя

У лік тых, хто павінен прадставіць дэкларацыю, уваходзяць грамадзяне, якія атрымліваюць даходы за мяжой або з-за мяжы. Гэта значыць, калі фізічная асоба ў мінулым годзе больш чым 183 дні знаходзілася на тэрыторыі краіны, яна прызнаецца падатковым рэзідэнтам Беларусі і павінна даць справаздачу па даходах, атрыманых за мяжой. А калі чалавек пражываў больш чым 183 дні за межамі краіны, па даходах за мяжой даваць справаздачу яму не патрабуецца. Яны абкладаюцца падаткам у краіне, дзе знаходзіліся. Тут ёсць некалькі ўдакладненняў.

Па-першае, падатковае рэзідэнцтва кліента вызначаецца ў дачыненні да кожнага каляндарнага года. Па-другое, **да часу фактычнага знаходжання на тэрыторыі нашай краіны адносіцца час непасрэднага знаходжання чалавека на тэрыторыі Беларусі, а таксама час, на які гэтая асоба выязджала за межы краіны: на лячэнне, у камандзіроўку ў адпаведнасці з заканадаўствам, на адпачынак, пры ўмове, калі час знаходжання на такім адпачынку ў сукупнасці не перавышаў двух месяцаў на працягу каляндарнага года.**

СТАР. 5

Працэс пайшоў

ПРЫШЧАПЛЯЦЬ ЦІ НЕ?

Урач — пра вакцынацыю падлеткаў супраць COVID-19

З канца снежня мінулага года ў Беларусі ад каранавіруснай інфекцыі пачалі прышчапляць падлеткаў ад 12 да 17 гадоў. Вакцынавацца можна ў дзіцячых паліклініках па месцы жыхарства, з'явіцца такая магчымасць і ва ўстановах адукацыі. Прышчапляюць падлеткаў кітайскай вакцынай Vero Cell. Дарэчы, у Кітаі яна прымяняецца для дзяцей ад трох гадоў. Пра асаблівасці вакцынацыі дзяцей мы паразмаўлялі з галоўным урачом 13-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Наталляй ГАГАНАВАЙ.

ТОЛЬКІ СА ЗГОДЫ БАЦЬКОЎ

— Наталля Васільеўна, як паліклініка рыхтавалася да вакцынацыі дзяцей?

— Калі з'явіліся адпаведныя загады Міністэрства аховы здароўя і Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама па вакцынацыі дзіцячага насельніцтва супраць інфекцыі COVID-19, мы зрабілі пэўныя арганізацыйныя захады. Тут маецца свая спецыфіка — новая вакцына, з якой раней нашы медыкі не працавалі. Добра, што вакцына Vero Cell у адрозненне ад таго ж «Спадарожніка» не замарожаная, але асаблівасць у тым, што яна двухдозная (адзін флакон утрымлівае дзве дозы, а значыць, прышчапіць варта двух чалавек. — **«Зв».**) і разліў не дапускаецца.

Мы падлічылі колькасць дзяцей з 12 да 18 гадоў, якія падлягаюць вакцынацыі. На тэрыторыі, замацаванай за нашай паліклінікай, іх жыве каля чатырох тысяч.

СТАР. 4

«Пры любых навацыях павінна быць забяспечана бесперабойнасць працэсаў у гаспадарчай дзейнасці»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

«Мной не раз даваліся даручэнні аб яе выкарыстанні для павышэння канкурэнтаздольнасці эканомікі, эфектыўнага расходавання грашовых сродкаў і недапушчэння рознага роду шэрых схем», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Урадам да абмеркавання падрыхтаваны праект указа, які дасць магчымасць выключыць нядобрасумленнае пасрэдніцтва і ўдасканаліць сістэму закупак за кошт бюджэтных і ўласных сродкаў арганізацый. «Аднак ***пры любых навацыях павінна быць забяспечана бесперабойнасць працэсаў у гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў з адначасовай эканоміяй грашовых сродкаў***», — заўважыў кіраўнік краіны.

«ЛІЧБУ» — У МІНІСТЭРСТВА

Другое пытанне — стварэнне на базе існуючага Міністэрства сувязі новага дзяржаўнага органа пад назвай Міністэрства лічбавага развіцця і сувязі. Прэзідэнт папярэдзіў: пры абнаўленні ведамства не павінна быць гонкі за модным плынямі.

«Калі нешта змяняем, змены павінны быць па сутнасці. І самае галоўнае — змяненні павінны быць запатрабаваны грамадствам, эканомікай», — дадаў кіраўнік краіны.

Ён адзначыў, што, дзякуючы бурнаму развіццю лічбавых тэхналогій свет сапраўды стаў мяняцца вельмі хутка і неабходна выкарыстоўваць усе перавагі гэтых працэсаў.

«З іншага боку, варта памятаць і разумець, што дзяржава ў прыняцці рашэнняў па рэгуляванні гэтай сферы павінна працаваць на апярэджанне. Таму сёння ўважліва разгледзім дадзенае пытанне. Мне паведамляюць, што ў Беларусі створана неабходная базавая інфраструктура, пабудавана развітая сетка перадачы даных, надзейныя цэнтры іх апрацоўкі і захоўвання, укаранёны сучасныя сродкі абароны інфармацыі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Але ён заўважыў, што гэтага недастакова: ***лічбавая сфера павінна не толькі паляпшаць побыт людзей, але і праз высокаэфектыўныя вытворчасці павышаць іх дабрабыт. Больш увагі, на думку кіраўніка краіны, неабходна ўдзяляць лічбавізацыі рэальнага сектара эканомікі, забеспячэнню канкурэнтаздольнасці прадпрыемстваў***.

Таму Прэзідэнт пры дакладзе папрасіў асабліву ўвагу звярнуць на тое, як стварэнне новага міністэрства будзе садзейнічаць якасным змяненням у жыцці нашых грамадзян і развіццю краіны.

«ДЗЯКУЙ БОГУ, ШТО НЕ СПАЛІЛІ СТАЛІЦУ»

Да рашэння трэцяга пытання (кіравання маёмасцю сумеснага домаўладання), сказаў Прэзідэнт, падвяло само жыццё. «Усе мы бачылі, які ўрон быў нанесены будынкам, збудаванням і грамадскай маёмасці ў выніку так званых пратэсных акцый. Дзякуй богу, што не спалілі сталіцу, як гэта зрабілі з фінансавай сталіцай Казахстана», — заўважыў кіраўнік краіны.

У пераважнай большасці выпадкаў шкода пабудовам у Мінску наносілася пры папушчальніцтве, а часам і па ініцыятыве кіраўнікоў арганізацый уласнікаў жылля, мяркуе Аляксандр Лукашэнка. А пасля на ліквідацыю наступстваў і навядзенне парадку накіроўваліся велізарныя грошы.

«Мной даваліся даручэнні аб узмацненні жорсткасці адказнасці старшынь праўленняў таварыстваў уласнікаў і іншых арганізацый за незабеспячэнне захаванасці, належнай эксплуатацыі і ўтрымання агульнай маёмасці. Якую пазіцыю яны займалі, я ўжо не кажу. Але ўсе мы гэта выдатна памятаем. Асабліва вопыт Казахстана дазваляе нам рабіць жорсткія высновы і гэтаксама жорстка дзейнічаць, не дапускаць падобных выпадкаў», — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

ФІНАНСАВАЯ АДУКАВАНАСЦЬ

Апошнім пытаннем на парадку дня стаў праект Указа «Аб фінансавым кансультаванні фізічных асоб».

«Тэмпы развіцця фінансавага рынку абумоўлены сучаснымі эканамічнымі тэндэнцыямі. Таму ў насельніцтва ўзнікаюць пэўныя праблемы з-за таго, што сярэдні ўзровень яго фінансавай адукаванасці не заўсёды паспявае за працэсамі, якія адбываюцца», — сказаў кіраўнік краіны.

Атрыманне дапамогі ў выбары фінансавай установы, непасрэдна саміх інвестыцыйных ці крэдытных прадуктаў — гэта пытанні, з якімі сутыкаецца большасць грамадства, заўважыў Прэзідэнт.

У дадзеным выпадку задача дзяржавы — сфарміраваць дзейсны інстытут прафесійнай дапамогі людзям, якія маюць патрэбу ў кваліфікаванай падтрымцы для кіравання сваімі фінансамі.

«Баюся я, вывучаючы гэтую ідэю, каб мы зноў не прыцягнулі тое, што ў грамадстве не запатрабавана. Таму хацеў бы па сутнасці паслухаць даклад па праекце адпаведнага ўказа», — дадаў кіраўнік краіны.

«КАБ ГЭТА НЕ БЫЎ ЦЯП-ЛЯП-ДАКУМЕНТ»

Першым дакладчыкам па тэме сістэмы закупак быў новы міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей Багданаў. Прэзідэнт яшчэ раз нагадаў яму пастаўленую пры назначэнні задачу — ведамства павінна набыць абсалютна іншае аблічча, знайсці сваё месца ў грамадскім жыцці, таму што яно вельмі запатрабаванае.

Аляксей Багданаў паведаміў, што абнаўленні ў сістэме закупак дазволяць сэканоміць бюджэтныя сродкі і павялічыць долю айчынных тавараў пры дзяржзакупках.

«Першае, што прапануецца, — забарона на ўдзел у дзяржзакупках афіліраваных асоб. Афіліраваныя змовы — адзін з карупцыйных складнікаў, што, паводле даследавання міжнародных агенцтваў, сведчыць: каля 20 працэнтаў наносіць шкоду закупкам тавараў. Змова дае завышэнне цэн. У праекце ўказа дадзена вызначэнне і паняцце, хто такія афіліраваныя асобы і як іх вызначыць», — расказаў міністр.

Другая навацыя — аперацыі па арэндзе і лізінгу будуць праводзіцца на конкурснай аснове, што дапаможа выключыць выпадкі набыцця імпартнага абсталявання ў абход конкурсу і беларускіх пастаўшчыкоў.

«Я намякаю на тое, што з прыняццем таго ці іншага нарматыўна-прававога акта, крый вас божа, канстатаваць факт, што гэтым мы не дабіліся жаданага, — заўважыў Прэзідэнт. — Я папярэджваю: каб гэта не быў цяп-ляп-дакумент. А потым, калі смажаны певень дзеўбане, вы прыбяжыце і пачняце мне расказваць, што тут не даглядзелі і давайце ўнясём дапаўненні і змены».

Марыя ДАДАЛКА.

Каментарый у тэму

Міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін ШУЛЬГАН расказаў, што пытанне абнаўлення ведамства вельмі важнае, бо лічбавізацыя закранае ўсе кірункі эканомікі і сацыяльнага жыцця.

«Таму кіраўніком краіны была нададзена асаблівая ўвага гэтаму ўказу, каб там былі закладзены нормы, што прынясуць значныя змяненні ў лепшы бок у жыцці грамадзян і галін эканомікі. У выніку абмеркавання былі вызначаны моманты, якія неабходна будзе прапрацаваць ва ўрадзе. Пасля гэтага дадзены праект указа будзе ўнесены кіраўніку краіны», — паведаміў міністр.

Стварэнне Міністэрства лічбавага развіцця і сувязі абмяркоўваецца на высокім узроўні ўжо доўгі час, і журналісты цікавяцца, калі будуць канкрэтныя рашэнні на гэты конт. Канстанцін Шульган заявіў: чакаць засталося нядоўга.

Ён падкрэсліў, што ўся дзейнасць па рэфармаванні накіравана на тое, каб вынікі адчулі ўсе сферы жыцця грамадства.

«За два гады прапрацоўкі гэтага ўказа наша міністэрства імкнецца жыць па новых правілах, няхай яны яшчэ і не зацвярджаны. Яны прадыктаваны ўмовамі жыцця. Развіццё ідзе, яго не спыніць, але яно павінна быць кіраваным і кіраваным дзяржаўнай сістэмай», — сказаў Канстанцін Шульган.

Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ заўважыў: шмат грамадзян скардзяцца на работу таварыстваў уласнікаў, што тыя мала ўдзяляюць увагі абслугоўванню жылых дамоў і налічваюць дадатковыя ўзносы.

«Сапраўды, нярэдкія выпадкі, калі адбываецца налічэнне дадатковых выплат за дадатковыя паслугі, якія не з'яўляюцца абавязковымі. Гэта вельмі непакоіць жыхароў гэтых дамоў. Таму мы сёння абмяркоўвалі гэта сур'ёзнае пытанне. У горадзе Мінску звыш 2000 таварыстваў уласнікаў», — сказаў мэр сталіцы.

Па яго словах, на нарадзе вырашылі працягнуць удасканальванне алгарытмаў, каб таварыствы працавалі ва ўстаноўленых рамках. І на гэты конт будуць унесены прапановы па зменах у заканадаўстве.

Мэр канстатаваў, што пасля пратэсных акцый гарадскім камунальным службам была нанесена значная шкода і на яе ліквідацыю пайшлі значныя грашовыя сродкі.

«Дарэчы, на сесіі гарсавета было прынята рашэнне наконт выяўлення выпадкаў наўмыснага нанясення шкоды маёмасці. Калі такія факты будуць вызначаны, сродкі на аднаўленне будуць спаганяцца з вінаватых у 100-разовым памеры. Гэты механізм мы ўжо выкарыстоўваем, ён даў эфект: паменшылася колькасць фактаў наўмыснай шкоды маёмасці», — расказаў Уладзімір Кухараў.

Кантэкст

Надзейнасць і моц брацкага пляча

Завяршылася міратворчая місія ў Казахстане

Вывад замежнага воінскага кантынгенту пачаўся ўчора і працягнецца дзесяць дзён. Беларускія вайскоўцы, якія разам са сваімі калегамі па АДКБ прымалі ўдзел ва ўрэгуляванні крызіснай сітуацыі ў Казахстане, днямі вернуцца на Радзіму.

— Створаныя аднагалосным рашэннем Савета калектыўнай бяспекі АДКБ Калектыўныя міратворчыя сілы арганізацыі з гонарам выканалі пастаўленыя перад імі задачы, — адзначыў падчас цырымоніі завяршэння міратворчай аперацыі, якая адбылася ўчора ў Алматы, **генеральны сакратар Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Станіслаў ЗАСЬ**.

Генсек АДКБ падкрэсліў, што міратворчая аперацыя на тэрыторыі Казахстана стала першым рэальным прымяненнем Калектыўных сіл АДКБ, дзе вайскоўцы

> Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Казахстана Касым-Жамарт Такаеў правялі тэлефонную размову, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.
>
> Касым-Жамарт Такаеў падзякаваў кіраўніку беларускай дзяржавы за падтрымку, у тым ліку ў рамках АДКБ, праінфармаваў аб сітуацыі і мерах, якія прымаюцца для яе стабілізацыі. Прэзідэнты таксама абмеркавалі шэраг двухбаковых пытанняў.

сваім прафесіяналізмам і зладжанымі дзеяннямі наглядна паказалі, што нашы дзяржавы гатовы ў любых умовах плячо ў плячо ў адзіным баявым страі абараніць агульную прастору бяспекі. Па словах Станіслава Зася, ваеннаслужачыя прадэманстравалі, што абаронны патэнцыял АДКБ з'яўляецца высокаэфектыўным і рэальна дзейнічае.

— Насуперак насаджаным некаторымі нашымі ворагамі негатыўным ацэнкам дзейнасці АДКБ наша арганізацыя паказала сваю запатрабавальнасць і эфектыўнасць, здольнасць дзейнічаць хутка, рашуча і эфектыўна, без прамаруджванняў, якія, як вядома, часам смерці падобныя, — заявіў генсек АДКБ. — Для Казахстана была прынцыпова важная не толькі ваенная, але і перш за ўсё маральная падтрымка саюзнікаў па АДКБ, якая была неадкладна аказана. У лічаных гадзіны пасля прыняцця Саветам калектыўнай бяспекі рашэння аб аказанні дапамогі першыя борты з кантынгентамі Калектыўных міратворчых сіл ужо вылецелі ў Казахстан.

Дзякуючы калектыўным дзеянням міратворцаў АДКБ, Узброеных Сіл і праваахоўных органаў Казахстана, абстаноўка ў краіне стабілізавалася. У некаторых рэгіёнах краіны з учарашняга дня адменены рэжым надзвычайнага становішча. Грамадства паступова вяртаецца да звычайнага жыцця.

У той жа час аднаўленне рэйсаў з Беларусі ў Алматы адбудзецца з 15 студзеня. «Авіякампанія ўважліва сочыць за падзеямі ў Казахстане, якія могуць аказаць негатыўны ўплыў на бяспеку палётаў, — паведамляецца на сайце авіякампаніі «Белавія». — Рэгулярныя рэйсы ў пункты Казахстана будуць выконвацца толькі па ўзгодненні з Дэпартаментам па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь і толькі пры безумоўным гарантаванні бяспекі палётаў. У той жа час авіякампанія «Белавія» разумее важнасць прамых авіязносін паміж Беларуссю і Казахстанам у бягучай сітуацыі, якія даюць магчымасць грамадзянам Рэспублікі Беларусь і іншых краін, якія знаходзяцца ў Казахстане, вылецець на радзіму».

Вераніка КАНЮТА.

Блізкая ўлада

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 15 студзеня, з 9.00 да 12.00, правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрый Мікалаевіч ВАЛЯВАТЫ. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатольевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

• старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Яўгенавіч КУХАРАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Для развіцця, стабільнасці і перспектыў

Абноўлены Асноўны Закон дэкларуе новыя магчымасці і гарантыі

Сёння кожны можа ўнесці прапановы ў праект Канстытуцыі перад тым, як яе канчатковы варыянт будзе вынесены на рэферэндум. У Магілёўскай вобласці створана некалькі дзясяткаў інфармацыйных груп, у абавязкі якіх уваходзіць неабходнасць растлумачыць насельніцтву сутнасць і змест навацый. На прадпрыемствах, ва ўстановах адукацыі, на іншых пляцоўках праходзяць сустрэчы з удзелам прадстаўнікоў улады, грамадскіх арганізацый, дэпутатаў.

Фота БелТА.

Нядаўна ў Магілёве адбыўся семінар па актуальных пытаннях падрыхтоўкі і правядзення рэферэндуму, своеасаблівая вучоба для ідэалагічнага актыву рэгіёна. У прысутных была магчымасць задаць пытанні намесніку кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігару Луцкаму, непасрэдным удзельнікам распрацоўкі праекта — старшыням пастаянных камісій Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі Сяргею Сіўцу і Міхаілу Русаму.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА адразу ж абазначыў важнасць і неабходнасць шырокай інфармацыйна-тлумачальнай работы.

— Змяненні, якія ўносяцца ў Асноўны Закон, маюць стратэгічнае рашэнне для нашай краіны ў цэлым і рэгіёна ў прыватнасці, — рэзюмаваў ён. — Пад кіраўніцтвам нашага Прэзідэнта створана незалежная дэмакратычная прававая сацыяльная дзяржава. За чвэрць стагоддзя яна стала адным з лідараў у ІТ-галіне, мы пачалі развіваць атамную энергетыку, аўтамабілебудаванне і многае іншае. Вырасла новае пакаленне беларусаў. Усё гэта абумоўлівае прыняцце новай Канстытуцыі.

Ігар ЛУЦКІ ў сваёй прамове падкрэсліў, што перамен перадусім патрабуе складаная знешнепалітычная абстаноўка.

— Існуючая Канстытуцыя ў 90-я гады стварыла аптымальныя ўмовы для развіцця грамадства, забяспечыла пераемнасць гістарычнага працэсу без узрушэнняў і шоку. Але ва ўмовах знешніх выклікаў і пагроз трэба забяспечыць сябе дадатковымі страхавочнымі механізмамі, а гэта канстытуцыйныя нормы. Новая Канстытуцыя павінна, з аднаго боку, закласці прававыя асновы развіцця Беларусі на дзесяцігоддзі наперад, з другога — стварыць умовы, каб забяспечыць гэтае развіццё.

Захаванне ідэнтычнасці беларускага народа — адзін з прыярытэтаў новай Канстытуцыі. Нездарма 2022-ы год абвешчаны Годам гістарычнай памяці.

— Мінулы год дазволіў вызначыць шляхі абароны дзяржаўнага суверэнітэту, адзін з якіх — шырокамаштабная работа па замацаванні дакладных гістарычных фактаў у масавай свядомасці беларусаў, — паведаміў Ігар Луцкі. — Мы ўстанавілі дзяржаўнае свята — Дзень народнага адзінства, прынялі шэраг заканадаўчых актаў, накіраваных на абарону нашага гістарычнага мінулага і выключэнне любых форм не толькі прапаганды, але і апраўдання дзеянняў нацыстаў і іх саўдзельнікаў. У новай Канстытуцыі замацавана норма, што патрыятызм, грамадзянская актыўнасць, захаванне гістарычнай памяці — доўг кожнага грамадзяніна.

Выступоўцы звярнулі ўвагу на тое, што ў аснову праекта Асноўнага Закона пакладзены выключна тыя прапановы, якія гучалі падчас сустрэч у розных калектывах, на дыялогавых пляцоўках.

— Члены Канстытуцыйнай камісіі і рабочай групы распрабавалі сфармуляваць іх у выглядзе пэўнай канстытуцыйнай прававой нормы, — падкрэсліў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ**. — Трэба, каб кожны разумеў, што стаіць за гэтай нормай, бо менавіта на яе аснове потым будзе фарміравацца ў цэлым прававая сістэма нашай дзяржавы. Толькі маштабнае ўсенароднае абмеркаванне дазволіць скарэкціраваць канчатковы тэкст змяненняў і дапаўненняў перад тым, як ён будзе вынесены на рэспубліканскі рэферэндум.

На погляд Сяргея Сіўца, у фокусе ўвагі беларусаў знаходзяцца пытанні рэалізацыі гарантый суб'ектыўных канстытуцыйных правоў, трансфармацыі палітычнай сістэмы краіны.

— Канстытуцыя — унутраны закон, пры гэтым вектар развіцця інтэграцыйных утварэнняў, удзельнікам якіх з'яўляецца Беларусь, застаецца нязменны, — рэзюмаваў Сяргей Сівец. — Мы настроены на тое, каб паглыбляць супрацоўніцтва ў рамках дагавора стварэння Саюзнай дзяржавы з Расіяй і тых 28 саюзных праграм, якія нядаўна былі прыняты. Пашыраць, гарманізаваць, а ў некаторых выпадках уніфікаваць лінейку сацыяльна-эканамічных правоў грамадзян абедзвюх дзяржаў. На парадку дня стаяць пытанні, звязаныя з нацыянальнай бяспекай, выходзячы з тых новых выклікаў і пагроз, з якімі сутыкнуліся і Беларусь, і Расія. Таму частка навацый, што прапануецца ў 4-м раздзеле Канстытуцыі, ускосна мае гэтыя мэты.

Прынцыпова новы раздзел — Усебеларускі народны сход (УНС). Шмат каго цікавіць яго роля і месца ў палітычным жыцці краіны. Сенатар паведаміў, што, калі змяненні і дапаўненні па Канстытуцыі будуць ухвалены, пачнецца распрацоўка спецыяльнага дакумента аб УНС, які рэгламентуе ўсе моманты, звязаныя з парадкам фарміравання і рэалізацыі кампетэнцый і паўнамоцтваў гэтай нормы.

Міхаіл РУСЫ звярнуў увагу на работу, якая была зроблена па змяненні Канстытуцыі. Навацыі ўнесены ў 80 артыкулаў Асноўнага Закона, два выключаны, а 11 новых унесена. Яны датычацца ў асноўным УНС і прэзідэнцкага тэрміну.

— Пашыраецца народаўладдзе. Усебеларускі сход — свайго кшталту баланс, — падкрэсліў ён. — Прэзідэнт, як палітык і чалавек, які перажывае за будучыню нашай краіны, даручыў адаптаваць праект, вывучыць вузкія пытанні і практыку іх прымянення. Мы гатовы выслухаць кожнага ахвотнага, растлумачыць пэўныя моманты, падыскутаваць. Законапраект апрацоўваецца вельмі ўважліва і педантычна — калі выкінуць адно-два словы, атрымаецца зусім іншы сэнс. Я думаю, што ў выніку дапрацоўкі мы выйдзем на дакумент, у якім добра чытаецца ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Новая Канстытуцыя стане дакументам развіцця, стабільнасці і перспектыў.

У адрас выступоўцаў прагучаў шэраг пытанняў і прапаноў. Напрыклад, **намеснік старшыні Магілёўскай абласной арганізацыі ветэранаў Валерый ЯЛЕНСКІ** падзяліўся занепакоенасцю тым, што некаторыя дзяржавы непавазліва ставяцца да гістарычнай памяці беларускага народа. Ён ліцыць, што ў Канстытуцыі абавязкова трэба больш канкрэтызаваць гэтае паняцце.

— Ветэраны аднадушна падтрымліваюць артыкул, дзе гаворыцца, што дзяржава гарантуе захаванне гістарычнай памяці пра подзвіг беларускага народа. Але было б правільна дапісаць «і праўду пра Вялікую Айчынную вайну». Ці можна ігнараваць заявы ЗША і Вялікабрытаніі ў тым, што яны адыгралі вырашальную ролю ў Перамозе над нямецка-фашысцкімі захопнікамі? У адной краіны загінула 300 тысяч чалавек і ў другой — 340 тысяч. Для параўнання: толькі пры вызваленні Польшчы склала галоў каля 600 тысяч чырвонаармейцаў. Там знаходзіцца шмат нашых воінскіх пахаванняў. Зараз спрабуюць сказіць, сфальсіфікаваць гісторыю, прыніжаць ролю Савецкага Саюза ў Перамозе над ворагам. Але ж саюзнікі нашы ўступілі ў вайну толькі ў 1944 годзе, калі выход яе быў ужо прадказальны, — звярнуў ён увагу.

Важнымі ветэран лічыць таксама прапісаныя ў праекце палажэнні аб канстытуцыйным абавязку быць патрыётам і праводзіць адпаведную работу, а таксама аб шлюбе і сям'і, дзе канкрэтызавана, хто можа брацца шлюбам.

Кіраўніцтва Магілёўскага аблвыканкама спадзяецца, што жыхары Магілёўскай вобласці не застануцца абыякавымі і прымуць актыўны ўдзел як у абмеркаванні праекта Асноўнага Закона, так і ў рэферэндуме, які зацвердзіць яго.

— Нельга заставацца ўбаку, калі вырашаецца такое сур'ёзнае пытанне, — заклікаў Анатоль Ісачанка. — Канстытуцыя адказвае на самыя важныя для кожнага з нас пытанні: як будзем жыць і працаваць далей, якім будзе ўзровень нашай сацыяльнай абароны і падтрымкі, што трэба для захавання самаідэнтычнасці. І сёння ёсць магчымасць нешта яшчэ ўдакладніць і ўдасканаліць. Каб потым з чыстым сэрцам прыйсці на рэферэндум і выканаць свой грамадзянскі доўг.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ДАСЛОЎНА

Протаіерэй Фёдар ПОЎНЫ, старшыня Сінадальнага аддзела па супрацоўніцтве са свецкімі ўстановамі адукацыі:

«Канстытуцыя — падмурак нашай рэспублікі. Той факт, што простыя людзі, кожны з нас удзельнічае ў яе складанні, уносячы свае прапановы, гаворыць аб рэальным народаўладдзі. І калі мы разам пішам Асноўны Закон краіны, асноўныя правілы жыцця нашага народа, абазначаем духоўныя прыярытэты, то ствараем тую дзяржаву, у якой хочам жыць. Стваральны шлях заўсёды лепшы за разбуральны. Мы, беларусы, здалі экзамен на міралюбнасць і таму маем права называцца мірнымі людзьмі. Мы цяпер у літаральным сэнсе ствараем свой лёс. Вызначаем будучыню. Таму для мяне важна, каб у асноватворным дакументе беларусаў была зафіксавана для ўсіх наступных пакаленняў ідэйная, духоўная, маральная канцэпцыя нацыі.

Дзяржава ўсклала на сябе клопат аб дзецях і моладзі. Гэта значыць, што яна спадзяецца на пачуцці ў адказ, на добрыя канструктыўныя ініцыятывы ад падрастаючых пакаленняў. Яна чакае, што моладзь будзе працаваць па пакліканні тут, у сябе на Радзіме, на карысць краіны і блізкіх. Яна верыць, што маладыя людзі будуць ствараць умовы для таго жыцця, якое бачаць лепшым, у сябе дома, пераадольваючы цяжкасці і застаючыся вернымі традыцыям.

У дзяржаве павінна быць ідэалогія. Але ідэалогія не як збор палітычных ідэй, як мы прывыклі яе ўспрымаць, і таму часта нават гэтае слова выклікае ў нас адмоўную эмоцыю. Ідэалогія павінна ўключаць нязменныя для народа духоўныя прынцыпы жыцця грамадства і патрабаванні да асобы. Гэта павінна быць духоўная канцэпцыя нацыі, якая заснавана на маралі. Вось, на мой погляд, кодэкс гонару беларуса правільна было б прапісаць у Асноўным Законе краіны. Тады сталі б пэўнымі паняцці патрыятызму, і грамадскай карысці, і здаровага ладу жыцця, і культуры памяці. Наша гістарычная памяць, якая бярэ свой выток далёка ў мінулым, у год, ёй прысвечаны, павінна быць ачышчана ад міфаў. І мы павінны вывучыць усе горкія ўрокі падзення чалавечага духу і слаўныя подзвігі яго ўзвышэння, каб лепш ведаць сябе як народ і ўпэўнена жыць сваім жыццём».

Калі ў вас з'явіцца меркаванні з нагоды праекта — пішыце ў рэдакцыю або непасрэдна ў арганізацыю, якая будзе акумуляваць і аналізаваць усе заўвагі і прапановы, — Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. Можна скарыстацца электроннай поштай sbor@ncpi.gov.by; можна запоўніць электронную форму, якая маецца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале па адрасе https://sbor.pravo.by; можна даслаць па пошце на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Берсана, 1А, НЦПІ, з пазнакай «Канстытуцыя».

ПРАЕКТ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Падрабязней на pravo.by

ПРЫШЧАПЛЯЦЬ ЦІ НЕ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі ж улічыць установы адукацыі, у тым ліку і сярэднія спецыяльныя на нашай тэрыторыі, дзе мы таксама мусім правесці вакцынацыю, атрымліваецца каля пяці тысяч дзяцей такога ўзросту. Зразумела, што не ўсе тыя падлеткі пойдуць на прышчэпкі. У адпаведнасці з загадам Міністэрства аховы здароўя яна магчымая толькі са згоды законнага прадстаўніка. Таму мы падрыхтавалі інфармацыю на нашы інфармацыйныя стэнды, на сайты паліклінікі і ўстаноў адукацыі, дзе расказалі, навошта праводзіцца вакцынацыя, якой вакцынай прышчапляюць, парадак правядзення.

— Ці адрозніваецца, дарэчы, парадак вакцынацыі дзяцей і дарослых?

— Прышчэпка робіцца толькі пасля агляду ўрача, які размаўляе з падлеткам, пытаецца пра скаргі на стан здароўя, змярае тэмпературу, глядзіць яго анамнез і прымае рашэнне, даваць дазвол ці не. Пасля ўвядзення вакцыны на працягу 30 хвілін варта знаходзіцца пад назіраннем.

Мы распрацавалі форму інфармаванай згоды, бо яна крыху адрозніваецца ад «дарослай». Там зразумелая для бацькоў інфармацыя: для чаго праводзіцца вакцынацыя, магчымыя рэакцыі. Бланкі інфармаванай згоды ўжо паступаюць да нас з тыпаграфіі. Мы іх раздаём дзецям ці бацькам, у тым ліку ў школах і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, іх з подпісам законнага прадстаўніка неабходна прынесці на вакцынацыю. Пасля прышчэпкі выдаецца яшчэ адзін бланк, дзе пазначана, што ўведзена першая доза вакцыны і калі трэба з'явіцца на другую прышчэпку.

— І колькі мусіць быць перапынак паміж прышчэпкамі?

— Інтэрвал складае 21+7 дзён. Гэта значыць, што стандартна ён 21 дзень, але можа быць перапынак да 28 дзён.

ПАБОЧНЫЯ РЭАКЦЫІ МАГЧЫМЫЯ, АЛЕ Ў ПАДЛЕТКАЎ ІХ ПАКУЛЬ НЕ НАЗІРАЛІ

— Якія рэакцыі могуць узнікнуць пасля прышчэпкі?

— Магчымы пад'ём тэмпературы, але гэта лічыцца нармальнай рэакцыяй пры выпрацоўцы імунітэту, а не негатыўным уздзеяннем вакцыны. Таксама можа быць мясцовая рэакцыя ў выглядзе болю ў месцы ўколу, лёгкія мышачныя болі, нязначнае недамаганне.

— Па вопыце першых вакцынаваных падлеткаў раскажыце, якія рэакцыі найчасцей сустракаюцца?

— Ніводнай мы пакуль не бачылі, усе дзеці пераносяць прышчэпку без пабочных рэакцый. Пакуль мы, вядома, прышчапілі не так шмат дзяцей, бо пачатак прышчэпачнай кампаніі прыпаў на пачатак канікулаў. Таму арганізаваныя дзіцячыя калектывы толькі падключаюцца. А сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў распачнуць вучобу толькі праз два тыдні.

— У паліклініках маюцца прышчэпачны кабінет і ўсе ўмовы для правільнага захоўвання вакцыны. А як арганізаваць вакцынацыю ў школах?

— Адразу скажу, што для нашага медыцынскага персаналу не трэба было праводзіць вялікай падрыхтоўчай работы, бо мы працавалі з дарослым насельніцтвам. Калі пачалася вакцынацыя дарослых, усе дзіцячыя паліклінікі горада актыўна падключыліся — мы працавалі ў складзе выязных прышчэпачных пунктаў у гандлёвых цэнтрах. Акрамя таго, на базе нашай паліклінікі праведзена больш за 500 прышчэпак для дарослых і ў нас маецца маразільнае абсталяванне на выпадак, калі для дзяцей з'явяцца вакцыны ў замарожаным выглядзе. Маюцца і кантэйнеры для транспарціроўкі вакцыны — у школы мы маем магчымасць перавозіць яе з захаваннем халадовага рэжыму. Так што нашы супрацоўнікі навучаныя, медыцынскія работнікі школ таксама прайшлі інструктаж. Як наш прышчэпачны кабінет, так і кабінеты ва ўстановах адукацыі цалкам абсталяваныя ўсім неабходным для правядзення вакцынацыі.

Паколькі прышчэпка робіцца толькі пасля агляду ўрача, то ў склад вакцынавальнай брыгады, акрамя медыцынскага работніка ўстановы адукацыі, уваходзіць і ўрач паліклінікі, ён будзе прыходзіць па запрашэнні ў вызначаны час.

ВАКЦЫНАВАЦЬ БУДУЦЬ У ШКОЛАХ І ІНШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ

— На гэтым тыдні дзеці прыйшлі з канікулаў і вярнуліся да навучання. У Мінску, напрыклад, бацькі атрымалі анкеты з пытаннямі, ці жадаюць яны прышчапіць дзяцей, дзе хацелі б тое зрабіць: у школе, паліклініцы, прышчэпачным пункце...

— Гэта ініцыятыва Гарадскога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Мы таксама размясцілі такую анкету на сваім сайце і раздаём у паліклініцы. Гэта інфармацыя для бацькоў і яшчэ адна нагода падумаць, ці жадаюць яны прышчапіць дзіця. Ну і для нас важная зваротная сувязь, мы хочам ведаць меркаванне бацькоў, каб падрыхтавацца арганізацыйна. Аднак маё глыбокае перакананне — магчымасць прышчапіцца мусіць быць і ў паліклініках, і ва ўстановах адукацыі, для гэтага там маюцца ўсе неабходныя ўмовы, і наяўнасць медыка гарантаваная.

— А як будзе арганізавана вакцынацыя ў каледжах і ліцэях?

— За нашай паліклінікай замацаваны чатыры сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы — каледжы электронікі, мастацтваў, лёгкай прамысловасці і ліцэй № 5. Іх навучэнцы будуць вакцынавацца на месцах з выхадам нашага ўрача. А вось размешчаныя на нашай тэрыторыі абслугоўвання медыцынскі каледж і ўніверсітэт «МІТСО» замацаваны за дарослай паліклінікай, але і там маюцца 17-гадовыя падлеткі, таму мы вызначыліся, што будзем прышчапляць і гэтых дзяцей. Мы правялі нараду з медработнікамі згаданых устаноў, яны ўжо раздалі навучэнцам формы інфармаванай згоды. Калі ахвотных зрабіць прышчэпкі будзе нямала, мы запросім іх у паліклініку, у адваротным выпадку арганізуем вакцыныцыю на базе медыцынскіх кабінетаў гэтых устаноў адукацыі з прыходам нашага ўрача.

СУПРАЦЬПАКАЗАННЯЎ АМАЛЬ НЯМА

— Якія супрацьпаказанні да прышчэпак супраць COVID-19 у падлеткаў?

— Як і ва ўсіх прышчэпак супраць інфекцыйных хвароб — наяўнасць інфекцыйнага захворвання ці якіх-небудзь іншых у востры стадыі. Лічыцца, што пры хранічных паталогіях супрацьпаказанняў амаль няма. З асцярожнасцю варта падыходзіць у адносінах анкалагічных і гематалагічных захворванняў, у востры перыяд прышчэпка выключаецца, вакцынавацца можна толькі ў час рэмісіі. Назапашаны з пачатку пандэміі вопыт сведчыць, што ход COVID-19 у такіх пацыентаў якраз больш цяжкі, таму такіх дзяцей хоць і з асцярожнасцю, але таксама пажадана вакцынаваць.

— Ці абавязковая інфармаваная згода бацькоў?

— Так. Нават калі падлетак самастойна звяртаецца ў паліклініку, яму варта прынесці згоду. У адносінах ковід-інфекцыі ў загадзе Міністэрства аховы здароўя дакладна вызначана, што да 17 гадоў уключна (а 17-гадовым падлеткам лічыцца да 17 гадоў 11 месяцаў і 29 дзён — фактычна да 18-годдзя) вакцынацыя робіцца толькі са згоды законнага прадстаўніка.

— Ці варта загадзя запісвацца на прышчэпку?

— У нас на сайце пазначаны нумар тэлефона, і бацькі, якія не жадаюць прышчапляцца ва ўстанове адукацыі, могуць патэлефанаваць і запісацца на прышчэпку ў паліклініцы. Для яе правядзення мы вылучылі асобны час — з 14 да 15 гадзін. У прышчэпачным кабінеце ў нас працуе ўрач, які зробіць агляд. Можна прыйсці і без запісу, але лепш запісацца, бо вакцына двухдозная, і пажадана, каб колькасць ахвотных прышчапіцца была цотнай. Можна прайсці папярэдні агляд і ў свайго ўчастковага педыятра і прышчапіцца ў любы час — прышчэпачны кабінет працуе з 8 да 20 гадзін.

— Калі падлетак нядаўна перахварэў, праз які час варта прышчапляцца?

— Калі дзіця хварэла на COVID-19, то вакцынацыю пажадана правесці не раней, чым праз шэсць месяцаў. Калі дзіця хварэла на іншую вірусную інфекцыю ці іншае захворванне, то тут патрэбны інтэрвал у месяц з моманту выздараўлення. Падыход такі ж, як і пры вакцынацыі ад іншых хвароб.

— Ці трэба рабіць тэст на антыцелы перад прышчэпкай?

— Не.

— Як вы адчуваеце настрой бацькоў? Ці ёсць у іх жаданне прышчапляць дзяцей? І, на ваш погляд, ці варта вакцынаваць дзяцей?

— Маё меркаванне як урача — вакцынавацца трэба. Бо ўсе мы бачым на прыкладзе нашых пацыентаў, блізкіх ды знаёмых, як цяжка можа праходзіць хвароба. Чацвёртая хваля была больш цяжкая і для дзяцей — іх у інфекцыйны працэс было ўцягнута нашмат больш, чым пры папярэдніх хвалях.

Асабіста я вакцынаваная ўжо бустарнай дозай, прышчэпленыя і ўсе члены маёй сям'і. У нашай паліклініцы вакцынаваныя 96 % супрацоўнікаў.

Што датычыцца бацькоў падлеткаў, то пакуль некаторыя ставяцца з асцярожнасцю. Але з пачатку прышчэпачнай кампаніі дзяцей прайшло не так шмат часу. Пры гэтым яшчэ да пачатку вакцынацыі былі бацькі, якія тэлефанавалі і цікавіліся, калі пачнецца вакцынацыя дзяцей. Так што запыт і настрой на вакцынацыю ў грамадстве ёсць. Трэба разумець, што ўплыў прышчэпкі на арганізм істотна меншы, чым ад самой хваробы і яе наступстваў. Вядома, ніхто не гарантуе на 100 працэнтаў, што вакцынаваны чалавек не захварэе, і мы бачым, што хварэюць і вакцынаваныя, але ў больш лёгкай форме, і ў асноўным яны абыходзяцца без стацыянарнага лячэння. А тыя, хто не вакцынаваўся, на жаль, хварэюць куды больш цяжка. Таму лепш вакцынавацца і засцерагчы сябе.

Алена КРАВЕЦ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Рэйтынг папулярнасці прэзідэнта ЗША абваліўся да 33 працэнтаў

Аб гэтым сведчаць вынікі апытання грамадскай думкі, якое праведзена даследчай службай Універсітэта Куінпэк, паведаміла ТАСС. Паводле яго звестак, з лістапада мінулага года рэйтынг адабрэння цяперашняга кіраўніка Белага дома знізіўся з 36 да 33 працэнтаў, у той жа час незадаволены яго рашэннямі 53 працэнты, астатнія не змаглі вызначыцца са сваім стаўленнем да амерыканскага лідара. Падтрымка Байдэна прыкметна знізілася і сярод прыхільнікаў Дэмакратычнай партыі — з 87 да 75 працэнтаў.

Рашэнні ўрада па эканоміцы, знешняй палітыцы і барацьбе з распаўсюджваннем каранавіруса выклікалі падтрымку толькі ў 34—39 % апытаных. Пасля года знаходжання Байдэна на сваёй пасадзе 39 працэнтаў рэспандэнтаў заявілі, што чакалі большага.

За мінулы тыдзень выявілі рэкордны COVID-прырост

Гэта адбылося ў сувязі з распаўсюджваннем штама «амікрон», адзначыў кіраўнік СААЗ Тэдрас Адханам Гебрэесус. «За мінулы тыдзень у СААЗ з усяго свету паступіла інфармацыя аб больш чым 15 мільёнах новых выпадкаў COVID-19. Пакуль гэта найбольшая за ўвесь час колькасць выпадкаў, выяўленых за адзін тыдзень, — і мы ведаем, што гэта заніжэнне», — заявіў Гебрэесус падчас прэс-канферэнцыі ў Жэневе. Кіраўнік СААЗ чарговы раз адзначыў неабходнасць вакцынацыі, асабліва ў тых краінах, дзе большая частка насельніцтва не атрымала ніводнай дозы прышчэпкі. У штотыднёвым эпідэміялагічным бюлетэні СААЗ паведамлялася, што агульнасусветная захваральнасць на COVID-19 за тыдзень узрасла на 55 % у параўнанні з папярэднім тыднем. У прыватнасці, у Паўднёваўсходняй Азіі колькасць новых выпадкаў павялічылася на 418 працэнтаў, аднак смяротнасць амаль не змянілася. Павелічэнне колькасці смерцяў на мінулым тыдні было выяўлена толькі ў афрыканскім (на 84 %) і ў амерыканскім (на 26 %) рэгіёнах.

Астраномы раскрылі таямніцу загадкавага аб'екта на адваротным баку Месяца

Аб'ект быў выяўлены з дапамогай кітайскага ровера «Юйту-2». Гэтая «таямнічая хаціна» аказалася проста каменем незвычайнай формы, паведаміў ухвалены кітайскім урадам акаўнт Our Space у WeChat. У снежні інжынеры, якія працавалі з «Юйту-2», убачылі на здымках Месяца дзіўны камень, падобны на хаціну. Астраномы жартавалі, што будынак належыць «піянерам іншапланетнай месяцовай праграмы». «Сапраўдную прыроду аб'екта ровер раскрыў, калі проста крыху наблізіўся да яго. З-за сваёй пацешнай формы аб'ект атрымаў новую мянушку — «нефрытавы трусік», — адзначылі навукоўцы. Як вядома, адваротны бок Месяца мае выяўлены рэльеф, які спярэшчаны кратарамі. Паколькі ён не бачны з Зямлі, то і вывучаны значна горш, і толькі фота з месяцаходаў і спадарожнікаў дапамагаюць дэталёва карціраваць і даследаваць гэтую тэрыторыю, канстатавалі астраномы.

ЗАПЛАЦІ ПАДАТКІ І СПІ СПАКОЙНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І яшчэ. Калі **чалавек адначасова з'яўляецца падатковым рэзідэнтам нашай краіны і замежнай дзяржавы, але міжнародны дагавор Беларусі па пытаннях падаткаабкладання з такой дзяржавай адсутнічае або не прымяняецца, альбо калі фізічная асоба не з'яўляецца падатковым рэзідэнтам ніводнай дзяржавы, то яна прызнаецца падатковым рэзідэнтам Беларусі, калі ў каляндарным годзе, за які вызначаецца падатковае рэзідэнцтва, мае наша грамадзянства або від на жыхарства.**

Асноўная маса даходаў з-за мяжы — гэта заработная плата, дывідэнды, працэнты па рахунках і ўкладах у замежных банках, выйгрышы ў замежных анлайн-казіно і на рынку «Форэкс». Дык вось, фактычна выплачаныя сумы падатку ў замежнай дзяржаве падлягаюць заліку пры вызначэнні сумы падаходнага падатку. Тут галоўнае — даць неабходныя дакументы. Гэты дакумент на сёння павінен быць завераны падатковай службай замежнай дзяржавы.

Вялікі пласт займаюць і грашовыя пераводы ад іншых грамадзян. Калі гэта блізкія сваякі (бацькі, дзеці, родныя браты і сёстры, дзядулі і бабулі, унукі), то падаходным падаткам гэтыя даходы не абкладаюцца незалежна ад іх памеру і падаваць падатковую дэкларацыю не патрабуецца. Тое ж адносіцца і да блізкіх сваякоў мужа. Калі мама вашай жонкі вам нешта падорыць з-за мяжы, вы падатак з гэтай сумы плаціць не будзеце.

Лічым прададзеныя машыны, кватэры і дамы

Наступная вялікая катэгорыя плацельшчыкаў — асобы, якія атрымліваюць даходы ад продажу нерухомай маёмасці, транспартных сродкаў. Але тут таксама ёсць асаблівасці. Калі на працягу года прададзена дзве кватэры, два жылыя дамы, два зямельныя ўчасткі, даходы ад другога аб'екта продажу абкладаюцца падаткам. Але гэта датычыцца дзвюх аднатыпных адзінак маёмасці, напрыклад, дзвюх кватэр. А калі прададзеныя, напрыклад, кватэра і жылы дом, ні тое, ні другое не абкладаецца падаткам.

Але тут варта адзначыць адзін важны момант пры продажы нерухомасці. Ільгота па адным адчужэнні даецца толькі ў дачыненні да кватэр, жылых дамоў, садовых домікаў (дач), зямельных участкаў, гаражоў і машынамесцаў. Калі прадаецца любая іншая нерухомасць, напрыклад, камерцыйная (офісы, гандлёвыя будынкі), то нават аднаразовы продаж абкладаецца падаткам.

Таксама па выніках года дэкларуюцца даходы ад продажы аднаго і больш аб'ектаў нерухомасці, якія не адносяцца да не завершанага будаўніцтвам капітальнага будынка, размешчанага на зямельным участку, выдзеленым для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, садаводства, дачнага будаўніцтва, у выглядзе службовага надзелу, кватэры, жылога дома з гаспадарчымі пабудовамі (пры іх наяўнасці), дачы, садовага доміка з гаспадарчымі пабудовамі (пры іх наяўнасці), гаража, машынамесца, зямельнага ўчастка. Да такіх аб'ектаў адносяцца, напрыклад, гандлёвыя, офісныя і адміністрацыйныя памяшканні.

Ёсць, зноў жа, выключэнне з правіл. Прадаваць у кароткі тэрмін можна любую колькасць дамоў, дач або зямельных участкаў і іншую нерухомасць, калі ўсё гэта было атрымана ў спадчыну. Плаціць падаткі ў гэтым выпадку не трэба, незалежна ад перыядычнасці адчужэння нерухомасці на працягу пяцігадовага перыяду.

Калі нешта атрымліваеш у дар

Што рабіць з тымі даходамі, якія ў мінулым годзе вы атрымлівалі ў выніку дарэння ў выглядзе нерухомай маёмасці па дагаворы рэнты бясплатна ад фізічных асоб? Правільна, іх трэба ўлічваць.

Падарункі ад асоб, якія не адносяцца да блізкіх сваякоў, ад сяброў абкладаюцца падаходным падаткам. Але ёсць падатковая льгота: сума да 7521 рубля, атрыманая летась, падаткам не абкладаецца. Гэта значыць, сумуюцца ўсе падарункі за 2021 год ад сяброў з-за мяжы і вызначаемся. Калі атрымалася менш за сем з паловай тысячы рублёў, то не трэба падаваць дэкларацыю і плаціць падатак. Калі выйшла больш, то дэкларацыя падаецца толькі ў дачыненні да сумы перавышэння і з гэтай жа сумы выплачваецца падаходны падатак. Вось так: калі вам падарылі 10 тысяч рублёў, тады вы плаціце падатак з 2,5 тысячы рублёў.

Грошы з пераплачаных падаткаў

У падатковым заканадаўстве прадугледжана даволі вялікая сістэма розных падатковых ільгот. Напрыклад, калі чалавек на працягу года прадаў два легкавыя аўтамабілі, гэта не значыць, што ўся сума з продажу другой машыны абкладаецца падаходным падаткам. У дадзеным выпадку ўлічваюцца выдаткі, звязаныя з купляй аўтамабіля.

Напрыклад, чалавек у пачатку 2021 года прадаў аўтамабіль і набыў новы за 10 тысяч рублёў. Ён паездзіў, яму не спадабалася, і машыну зноў прадаў. Так здарылася, што ў яго на працягу года адбылося два продажы, і з другога ён павінен заплаціць падатак. Напрыклад, ён прадаў другую машыну за 11 тысяч рублёў. Адпаведна, падатак ён будзе выплачваць толькі з розніцы — з адной тысячы рублёў. А калі чалавек прадаў машыну танней, чым набыў, то падатку ў яго наогул не будзе, паколькі выдаткі перавышаюць даходы. Але прадставіць дэкларацыю неабходна і ў гэтым выпадку.

Выдаткі на нерухомую маёмасць, транспартныя сродкі неабходна пацвердзіць дакументальна: прынесці дагавор на куплю, на будаўніцтва, плацежныя дакументы. Але ў Падатковым кодэксе ёсць яшчэ дзве важныя нормы. Калі ў чалавека дакументы не захаваліся, то ў падатковым органе могуць быць зведскі, прадстаўленыя дзяржорганамі, аб памеры выдаткаў. Напрыклад, чалавек набыў аўтамабіль, паставіў яго на ўлік у ДАІ, прадставіў туды дакументы, і супрацоўнікі ДАІ ўнеслі зведскі, што машына была набыта за 10 тысяч рублёў. Потым чалавек дагавор страціў. Ён звяртаецца ў падатковы орган, там глядзяць базу даных ДАІ і нават пры адсутнасці дакументаў гэтыя выдаткі чалавеку ўлічваюць. У самым крайнім выпадку, калі няма дакументаў і падатковы орган не можа ніяк афіцыйна атрымаць гэтыя зведскі, тады падатковае заканадаўства прадугледжвае вылік — 20 % не абкладаць падаткам.

Вылікі — рэч карысная

У нас ёсць і тыя, хто можа падаць у інспекцыю дэкларацыю з мэтай атрымання падатковых вылікаў. У прыватнасці, гэта датычыцца людзей, якія атрымлівалі ў мінулым годзе аўтарскія ўзнагароджанні або ўзнагароджанні за стварэнне, выкананне або іншае выкарыстанне твораў навукі, літаратуры і мастацтва, выплаты аўтарам вынаходніцтваў, карысных мадэляў, прамысловых узораў і іншых вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці.

Дэкларацыю варта запоўніць таксама спартсменам і іх трэнерам, якія атрымлівалі даходы ад асабістай дзейнасці за ўдзел у спартыўных спаборніцтвах пры ўмове, што такая дзейнасць ажыццяўлялася імі не ў рамках каманднага ўдзелу.

Якімі падатковымі льготамі (вылікамі) можа скарыстацца фізічная асоба?

Лепш не хадзіць, а падаць дыстанцыйна

Фактычна ёсць тры асноўныя спосабы падачы падатковай дэкларацыі: асабіста шляхам наведвання падатковага органа, па пошце і ў электронным выглядзе. У першым выпадку фізічная асоба запаўняе дэкларацыю і з пашпартам звяртаецца ў падатковы орган. У нас дзейнічае прынцып экстэрытарыяльнасці абслугоўвання. Гэта значыць, чалавек звяртаецца ў любую інспекцыю, незалежна ад таго, дзе ён пражывае, дзе зарэгістраваны, дзе знаходзіцца на падатковым уліку. Напрыклад, калі вы прапісаныя ў Віцебску, але жывяце і працуеце ў Мінску, можаце спакойна звярнуцца ў любую падатковую, як вам будзе зручна. Там усё зробяць, паведамленне на выплату вы атрымаеце.

Другі спосаб — падача дэкларацыі праз паштовую сувязь. З любой даведачнай сістэмы альбо з афіцыйнага сайта падатковых органаў можна спампаваць бланк дэкларацыі, запоўніць яго ўручную або на камп'ютары, раздрукаваць, падпісацца і накіраваць па пошце. У гэтым выпадку дата падачы дэкларацыі — дзень паштовага адпраўлення. Калі хтосьці не паспявае звярнуцца ў падатковы орган, ён можа 31 сакавіка адправіць дэкларацыю. Нягледзячы на тое, што яна прыйдзе ўжо ў красавіку, чалавек тэрмін не парушыць.

Самы перспектыўны на сёння спосаб — падача ў электронным выглядзе. Тут ёсць важная асаблівасць. Чалавеку неабходна аднаразова звярнуцца ў любы падатковы орган з пашпартам, каб зарэгістравацца ў асабістым кабінеце плацельшчыка, атрымаць уліковы запіс і пароль. Вялікая перавага ў тым, што дэкларацыю ў электронным выглядзе можна падаць з любога пункта свету, не трэба нікуды ездзіць. Другі вельмі важны плюс у тым, што такім плацельшчыкам бліжэй да канца студзеня ўжо прадстаўляецца папярэдне запоўненая форма дэкларацыі. Гэта значыць, там ужо ёсць усе персанальныя даныя і ўся наяўная ў падатковых органаў інфармацыя (аб даходах з-за мяжы, аб продажы транспартных сродкаў і нерухомасці). Чалавеку трэба прагледзець даходы, прыбраць тое, што не абкладаецца падаткам, напрыклад, пераводы ад блізкіх сваякоў.

Калі нейкіх даных недастаткова, трэба дапоўніць іх і адправіць. Грамадзяніну не патрэбен ключ, электронны лічбавы подпіс, яму дастаткова мець уліковы запіс і пароль.

Паведамленне на выплату падаткаў таксама прыйдзе электронным спосабам: яно можа прыйсці як у асабісты кабінет, так і на адрас электроннай пошты, які чалавек пакіне пры рэгістрацыі. Меню асабістага кабінета дае мноства магчымасцяў. Адтуль можна выплаціць падатак пры наяўнасці банкаўскай карты і інтэрнэт-банкінгу шэрагу беларускіх банкаў. Падаў дэкларацыю ў электронным выглядзе, такім жа спосабам атрымаў паведамленне, зайшоў у асабісты кабінет, убачыў суму падатку і аплаціў. Таксама ў асабістым кабінеце можна ўбачыць і стан разлікаў з бюджэтам, падаць электронны зварот.

Што трэба зрабіць, каб вярнуць падатак

Спачатку трэба падаць у інспекцыю падатковую дэкларацыю за мінулы год і адлюстраваць у ёй звесткі аб атрыманых даходах. Да дэкларацыі абавязкова павінна быць прыкладзена даведка аб падатковага агента аб налічаным даходзе і ўтрыманым падатку па ўсталяванай форме. Далей трэба адлюстраваць у падатковай дэкларацыі звесткі аб праве фізічнай асобы на атрыманне пэўных падатковых ільгот.

Увага! Да дэкларацыі абавязкова павінны быць прыкладзены дакументы, якія пацвярджаюць права фізічнай асобы на атрыманне падатковых ільгот.

Пасля таго як падатковы орган зробіць перараслік падаходнага падатку і разлічыць суму падатку да вяртання, трэба напісаць заяву на вяртанне падатку па пэўнай форме.

Вяртанне падатку ажыццяўляецца двума спосабамі:

— на рахунак, адкрыты ў банку, у тым ліку карт-рахунак;

— наяўнымі грашовымі сродкамі з касы банка, у якім абслугоўваецца падатковы орган.

Калі фізічная асоба жадае вярнуць падатак на свой банкаўскі рахунак, то ў заяве на вяртанне падатку неабходна ўказаць рэквізіты банкаўскага рахунку: нумар і тып рахунку, найменне банка, код банка, код валюты. На працягу 15 рабочых дзён з моманту падачы заявы на вяртанне падатку атрымаць грошы.

І яшчэ. **Для плацельшчыкаў, якія падаюць падатковую дэкларацыю выключна з мэтай атрымання падатковых вылікаў па падаходным падатку, тэрмін яе прадстаўлення не абмежаваны 31 сакавіка.**

Да ведама

Незалежна ад рэгістрацыі ў кватэры працаздольных грамадзян і без каэфіцыентаў

Улічваючы, што да цяперашняга часу меў месца няроўны падыход у частцы падаткаабкладання нерухомасці, размешчанай у горадзе (кватэры) і сельскіх населеных пунктах (жылыя дамы), было прынята рашэнне з 2022 года вызначыць для ўсіх грамадзян аднолькавы падыход у частцы падаткаабкладання кватэр і жылых дамоў.

Так, з гэтага года кватэры і жылыя дамы будуць абкладацца падаткам на нерухомасць аднолькава.

З мэтай абароны сацыяльна ўразлівых слаёў насельніцтва (пенсіянеры па ўзросце, дзеці да 18 гадоў, шматдзетныя, інваліды I і II груп і іншыя), якім належыць адна кватэра і адзін жылы дом, вызваляюцца ад падатку на нерухомасць у поўным памеры незалежна ад рэгістрацыі ў такой нерухомасці працаздольных грамадзян.

Пры гэтым, калі ў пералічанай катэгорыі грамадзян на праве ўласнасці знаходзяцца дзве і больш кватэры ці два і больш жылыя дамы, то адна кватэра або адзін жылы дом з найбольшай цаной будуць цалкам вызвалярца ад падатку на нерухомасць. Для ўсіх аб'ектаў нерухомасці стаўка падатку складае 0,1 %.

І яшчэ. **Улічваючы, што з гэтага года абкладаецца адна кватэра, якая належыць фізічнай асобе на праве ўласнасці, з мэтай мінімізацыі падатковай нагрузкі Падатковым кодэксам прадугледжана, што павышальныя каэфіцыенты, якія вызначаюцца мясцовымі Саветамі дэпутатаў, да стаўкі падатку на нерухомасць (да двух разоў) не прымяняюцца пры вылічэнні падатку на нерухомасць у дачыненні да кватэр.**

У выніку чаго сярэдні памер падатку на нерухомасць за адну кватэру ў Мінску складзе каля 50—60 рублёў, у абласных гарадах — каля 45—50 рублёў, у буйны раённых цэнтрах — каля 40 рублёў, у іншых населеных пунктах — каля 30 рублёў.

Сяргей КУРКАЧ.

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Магия Ola!»

Завершилась Рекламная игра «Магия Ola!», участие в которой могли принять все граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане или лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь достигшие возраста 14 лет, которые выполнили условия п.10 правил Рекламной игры.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором и (или) заинтересованными лицами, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Рекламной игре было необходимо:
в период с 27 октября 2021 г. (09:00:00) по 19 декабря 2021 г. (23:59:59):

• Приобрести не менее одного Игрового продукта, согласно перечню, указанному в п. 8 правил Рекламной игры, в одном кассовом/товарном чеке и получить кассовый/товарный чек, подтверждающий приобретение Игрового товара.

• Зарегистрироваться на сайте www.foryouola.by, заполнить регистрационную форму, указав:

✓ персональные данные Участника: фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (при наличии), почтовый адрес (обязательно): почтовый индекс (желательно), область (желательно), район (желательно), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно), дом (обязательно), корпус (при наличии), номер квартиры (при наличии);

✓ адрес электронной почты (обязательно);

✓ номер мобильного телефона Участника в международном формате и название оператора (A1, MTC, Life) (обязательно);

• Загрузить фото или скан кассового/товарного чека с наименованием Игрового продукта в личном кабинете, указав дату и время покупки.

• Сохранить кассовый(-ые)/товарный(-ые) чек(-и) до окончания Рекламной игры.

По результатам проведения Рекламной игры все 33 приза нашли своих обладателей.

Организатор Рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «Пиар Куб», УНП 192452588, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 31 марта 2015 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192452588 (далее – Организатор).

Место нахождения Организатора: 220030, г. Минск, ул. Ленина, д. 50, 5-й этаж, пом. 1.

Наименование Рекламной игры: «Магия Ola!»
Срок начала Рекламной игры: 27 октября 2021 г.
Срок окончания Рекламной игры: 15 января 2022 г.
Период, в течение которого можно стать Участником Рекламной игры: с 27 октября 2021 г. по 19 декабря 2021 г.

Рекламная игра зарегистрирована 22 октября 2021 года Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, Свидетельство о регистрации Рекламной игры № 4093.

Общее количество участников: 4 188 человек.

Призовой фонд был разыгран полностью.

Полный список победителей Рекламной игры размещен на сайте: **www.foryouola.by**

Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры +375 (29) 381-00-85.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «СДСК»** (УНП 400024628) 247439, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 10, в лице антикризисного управляющего ООО «Правовая стратегия», тел. + 375 (17) 396-61-34.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **31 января 2022 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

№ п/п	Предмет торгов	Цена предмета торгов с НДС, руб.
1	Капитальное строение с инв. № 342/С-72984, общ. пл. 207,0 кв. м, здание склада, на зем. участке с кадастровым № 325050100002005436, общ. пл. 0,0471 га, г. Светлогорск, ул. Заводская, 6А	15 936,00
2	Капитальное строение с инв. № 342/С-72804, общ. пл. 413,0 кв. м, здание склада № 2, на зем. участке с кадастровым № 325050100002005434, общ. пл. 0,0976 га, г. Светлогорск, ул. Заводская, 6Б	31 776,00
3	Грузовой специальный автобетоносмеситель МАЗ 533702 280 СМБ-249. 2006 г/в. Рег. знак АК8701-3, № рамы Y3BCME24961000437/ Y3M53370260007796, цвет белый	11 616,00
4	Гидроманипулятор «Джонсэред» с комплектом для установки	7392,00
5	«Ленточнопильный станок МВ-2000м» производства ОДО «Технолессервис» г. Дзержинск РБ, инв. бух. № 0007571	4416,00

Местонахождение – г. Светлогорск, ул. Заводская, 10.
Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 15.01.2022 г. с 09.00 по 28.01.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 27.11.2021 г.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ООО «Утилизатор»** (УНП 491310209) 246007, Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 27, тел. +37529 345 09 66.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **27 января 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов – ГРУЗОВОЙ СЕДЕЛЬНЫЙ ТЯГАЧ DAF XF440FT, 2016 г. в., рама № XLRTEH4100G129553, цвет белый.

Начальная цена предмета торгов – 139 200,00 бел. руб. с НДС.
Местонахождение: г. Гомель, ул. Федюнинского, 27.
Контакт для ознакомления и осмотра: +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 15.01.2022 г. 09.00 по 26.01.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 24.11.2021 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона, оператор ЭТП	**ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by**
Продавец	**ОАО «Столбцовский РКБО», Минская область, г. Столбцы, ул. Я Коласа, 28**

Предмет торгов:

Лот	Наименование (назначение), инвентарный номер	Начальная цена с НДС (бел. руб.)
801	Капитальное строение, 622/С-46405	17 460,00
802	Капитальное строение, 622/С-46404	15 180,00
803	Капитальное строение, 662/С-46902	13 440,00
804	Капитальное строение, 662/С-46903	9 600,00
830	Имущества согласно приложению 1	882,00
809	Промышленная швейная машина 1022 класса (г. Орша) в комплекте с рабочим столом – 10 шт.	1 260,00
810	Промышленный оверлок ZOJE ZJ 757A-516M – 3 шт.	1 323,00
811	Швейная машина (Пуговичная) – ZOJE ZJ373 – 1 шт.	810,00
812	Швейная машина (Петельная) ZOLE ZJ781	1 512,00
813	Швейная машина ZOjE - ZJ5300	450,00
814	Гладильный стол Futura Maxi C5	450,00
815	Гладильный стол Легмаш	180,00
816	Шиномонтажный стенд OMA	1 350,00
817	Станок балансировочный АФ-11 Сторм	900,00
818	Подъемник 2-стоечный гидравл. Flying	2 250,00
819	Станок 3К 634 точильно-шлиф.	1 080,00
820	Станок сверлильный 380 В	180,00
870	Баллон углекислотный с редуктором	90,00

расположенные по адресу:
Минская обл., Столбцовский р-н

Размер шага составляет **5 %** от начальной цены лота

Задаток 10 % от начальной цены предмета торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после торгов

Условия оплаты предмета торгов

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **10 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более
1 400,00 бел. руб. для каждого лота 801–804,
лот 830 не более 850,00 бел. руб.,
лоты 809–820 не более 650,00 бел. руб.

Дата и время начала торгов: 01.02.2022 с 09.00 до 16.00
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов

Для участия в торгах необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке **www.torgi24.by**.
Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by**.
Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с 14.01.2022 по 28.01.2022 г. до 17.00

Контактные данные:
+375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.
E-mail: info@torgi24.by

16 февраля 2022 г. **№ 3-Н/2022**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с продажей права заключения договора аренды земельного участка в г. Гомеле

№ лота	Наименование объекта/адрес земельного участка: г. Гомель	Целевое назначение	Кадастровые номер, площадь земельного участка	Начальная стоимость, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку док-ции, руб.	Наличие ограничений, обременений
1	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Красный Маяк, ул. Донецкая, 21	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	340100000008006612, 0,0845 га	8 528,31	850,00	4 018,00	Зона санитарной охраны водопроводных сооружений, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, присутствуют следы проведения земляных работ

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).

1.1. **Начальная цена** предмета аукциона **лота № 1** определена как сумма начальной цены не завершенного строительством жилого дома согласно заключения об оценке РУП «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в размере **4 761,72** бел. руб. и начальной цены права заключения договора аренды земельного участка в размере **3 766,59** бел. руб.

2. **Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов на земельном участке в г. Гомель, предоставляемом в аренду сроком на 99 лет, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.** Получить в установленном порядке разрешительную документацию на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство одноквартирного жилого дома. Желающим предварительно ознакомиться с документами обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. №№ 3–6, №№ 3–14).

3. **Аукцион состоится 16 февраля 2022 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16,** при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на **5 процентов.**

4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели Республики Беларусь и юридические лица, а также иностранные юридические лица, иностранные граждане. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавших в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указание транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц.** Индивидуальные предприниматели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.

Перечень документов, представляемых участником:

4.1. заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; **гражданам Республики Беларусь** – копия паспорта, **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность.

4.2. представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.3. идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.4. представители индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.5. представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождениия (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон, в процессе подготовки и проведения аукциона.

6. **Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

6.1. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников).

6.2. После совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона местный исполнительный комитет заключает договор аренды земельного участка.

6.3. Гомельским горисполкомом может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 14 января по 14 февраля 2022 г. включительно. Дни приема: *понедельник, среда, пятница* с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14.**
Контактный телефон +375 232 30-12-46.
Информация размещена на сайте: www.geodezcentr.by, gomeloblzem.by и газета «Звязда»

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
14 студзеня 2022 г. № 1 (637)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

КАНСТЫТУЦЫЯ. АКЦЭНТЫ

Фота БелТА.

Наталля КАЧАНАВА:

«У КАНСТЫТУЦЫІ МЫ ПАВІННЫ ЎЛІЧЫЦЬ МЕРКАВАННЕ ЎСІХ»,

або Скіраванасць на канструктыўную работу па абмеркаванні Асноўнага Закона

СТАРШЫНЯ Савета Рэспублікі Наталля Качанава ў панядзелак, 10 студзеня, правяла прыём грамадзян па прапановах і заўвагах у праект Канстытуцыі.

Лёс краіны ў цэнтры ўвагі

Спікер верхняй палаты прыняла ўдзел у дзейнасці грамадскай прыёмнай, якая з мінулага тыдня распачала работу ў Савеце Рэспублікі. Традыцыйна да Наталлі Качанавай вялікая колькасць ахвотных трапіць на асабісты прыём. І гэты раз не стаў выключэннем. Трэба сказаць, што прыйшлі не толькі з прапановамі ў Асноўны Закон, але і з жыццёвымі праблемамі, просьбамі і парадамі.

Ініцыятыўная група народна-патрыятычнага руху «Спектр», які пакуль не зарэгістраваны, прыйшла з трапнымі заўвагамі па некалькіх артыкулах праекта Канстытуцыі. Дарэчы, члены руху з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі патрыятычных акцый, якія перыядычна праводзяцца каля станцыі метро «Уручча» побач з гандлёвым цэнтрам «Спектр» у падтрымку сілавікоў, таму лёс краіны іх вельмі хвалюе.

У прыватнасці, актывістка, педагог па адукацыі Вольга Аляксандраўна падкрэсліла, што мэта сённяшняга візіту — каб моладзь і наступныя пакаленні маглі жыць пад мірным небам Беларусі.

Заяўнікі звярнулі ўвагу на неабходнасць карэкціроўкі артыкулаў 4, 8, 18, 32, 33, 81 і 83 праекта Канстытуцыі. Так, людзі лічаць, што трэба прапісаць у Асноўным Законе не толькі наяўнасць шматлікай колькасці ідэалогій, але і дзяржаўную і афіцыйную, каб было зразумела, у якім напрамку рухаецца дзяржава. Звяртаюць увагу яны і на тое, што адысці ад міжнародных нормаў і прынцыпаў краіна не можа, але лічаць неабходным замацаваць прыярытэтным прынцыпы беларускага заканадаўства. Перакананы заяўнікі і ў тым, што здраднікаў Айчыны трэба пазбаўляць грамадзянства.

— У Канстытуцыі БССР 1938 года было прапісана, што самае цяжкае злачынства — гэта здрада Радзіме, — нагадвае **Вольга ГАНЧАРЫК.**

Паставіць заслону

Не пакінуў актывістаў раўнадушнымі і артыкул 32 адносна сямейнага саюза, які можна быць замацаваны толькі паміж мужчынам і жанчынай. Заяўнікі перакананы: трэба дадаць заўвагу — па нараджэнні. Таксама яны лічаць неабходным прадугледзець поўную забарону прапаганды ЛГБТ-руху.

Цікавае меркаванне выказалі людзі і адносна дзейнасці СМІ: у праекце замацавана, што манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі недапушчальная, аднак яны перакананы: цэнзура ўсё ж павінна быць. І рабіць гэта трэба, каб паставіць заслону таму бруду і фэйкам, што запаланілі інфармацыйную прастору краіны.

Акцэнтавалі ўвагу заяўнікі і на артыкуле 81-м, якім абмяжоўваецца тэрмін паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы. Людзі лічаць, што два тэрміны пры сапраўдным моцным лідары нацыі — гэта недастаткова. Трэба прадугледзець механізм магчымасці ўдзелу ў выбарах на трэці тэрмін.

стар. 8

АКЦЭНТЫ

Мы будзем разам, каб захаваць мір і стабільнасць

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА ацаніла дзейнасць міратворчых сіл АДКБ у Казахстане.

— Мы ў Беларусі з глыбокай трывожнасцю ўспрынялі падзеі, якія адбыліся ў нашай сяброўскай краіне — Казахстане. І беларускія міратворцы ехалі туды не ваяваць, а абараніць народ, — заявіла ў гутарцы з журналістамі спікер верхняй палаты парламента падчас наведвання Мінскага падшыпнікавага завода і сустрэчы з яго працоўным калектывам.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на наступствы спробы знешніх сіл здзейсніць дзяржпераварот у гэтай краіне:

— Мы разумелі выдатна, што гэта перш за ўсё пакуты краіны і яе народа. У дзень жалобы 10 студзеня мы, члены Савета Рэспублікі, накіравалі спачуванне дружалюбнаму народу і нашым калегам-парламентарыям, — расказала яна.

Кажучы аб накіраванні міратворчых сіл АДКБ у Казахстан, Наталля Качанава адзначыла, што прынятае рашэнне было абсалютна правільным.

— Мы як актыўны ўдзельнік Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы адгукнуліся на просьбу прэзідэнта Казахстана, каб аказаць дапамогу нашаму дружалюбнаму народу і стабілізаваць сітуацыю, якая адбывалася ў гэтай краіне. Гінулі людзі, мірныя людзі! Гэта страшна, — падкрэсліла яна. — Вы бачылі, якая сітуацыя там складвалася ў гэтыя дні, гэта жудасна, калі гінуць людзі, у тым ліку дзеці, у абсалютна мірны час. Зразумела, мы не маглі дзейнічаць па-іншаму.

Працягваючы тэму, спікер адзначыла, што сёння бакі дагавора яшчэ больш разумеюць, што ўмацоўваць сілы АДКБ неабходна.

— Мы павінны быць разам у вырашэнні такіх важных і складаных задач, якія ўзнікаюць перад якой-небудзь асобна ўзятай краінай, — перакананa Старшыня Савета Рэспублікі. — Кожная краіна разбярэцца са сваімі ўнутранымі пытаннямі сама. І я ўпэўнена, што мудры казахстанскі народ разбярэцца з праблемамі, якія ёсць у яго краіне. Але важна, што ў цяжкую хвіліну мы апынуліся побач. Нашы міратворцы ехалі туды не ваяваць, а абараніць народ, дапамагалі ў ахове жыццёва важных аб'ектаў. Упэўнена, мы справімся з дадзенай задачай — і гэта ўрок для ўсіх: усе павінны разумець, што члены АДКБ заўсёды будуць разам для таго, каб захаваць мір і стабільнасць у нашых краінах.

Вольга АНУФРЫЕВА.

АНОНС

Пытанне да сенатара

У чацвер, 20 студзеня, з 10.00 да 13.00 старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Міхайлавіч СІВЕЦ правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб, па адрасе: г. Мінск, вул. Кірава, 47.

Адзначым, што асабісты прыём будзе праходзіць па папярэднім запісе. Для гэтага трэба накіраваць у Савет Рэспублікі пісьмовы зварот (220016, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 9) або электронны (форма для запаўнення размешчана на сайце http://sovrep.gov.by/ru/el_obr).

Калі ўзніклі пытанні, тэлефануйце па нумары 8 (017) 327 46 74.

«У КАНСТЫТУЦЫІ МЫ ПАВІННЫ ЎЛІЧЫЦЬ МЕРКАВАННЕ ЎСІХ»

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

— У выпадку абсалютнага даверу і відавочнага ўкладу кіраўніка дзяржавы па рашэнні УНС яго кандыдатура павінна быць вынесена для ўдзелу ў выбарах на не прадугледжаны Канстытуцыяй трэці тэрмін, — лічаць актывісты.

Яны таксама просяць замацаваць у Асноўным Законе і ўдзел нашай краіны ў такіх міжнародных арганізацыях і дагаворах, як АДКБ, СНД, ЕАЭС, і іншых.

Сотні нарматыўных прававых актаў у развіццё Канстытуцыі

— Вы абсалютна правільна разумееце тыя працэсы, якія адбываюцца ў нашай краіне і вакол яе, таму што разумныя людзі гэта дакладна разумеюць і асэнсоўваюць: што мы мелі, што маглі б мець і што магло адбыцца з намі, — звярнулася да ініцыятыўнай групы Наталля Качанава, падсумоўваючы іх прапановы.

Яна пераканана: кожны дзень дае падказкі для таго, каб разумныя людзі мелі магчымасць усё супаставіць.

— Мы бачылі, якая наша краіна, як мы жывём і што маем, — падкрэсліла спікер і выказала ўдзячнасць заяўнікам за глыбока прааналізаваны дакумент, над якім дастаткова доўга працавалі Канстытуцыйная камісія і рабочая група. — Вы маеце рацыю, што ў Канстытуцыі мы павінны ўлічыць меркаванне ўсіх: людзі розныя ў нашай краіне, і меркаванні абсалютна розныя.

Наталля Качанава нагадвае: Канстытуцыя — гэта Асноўны Закон, у развіццё якога будзе прынята вялікая колькасць заканадаўчых актаў, што з'явіцца пасля правядзення рэферэндуму.

— Зараз мы акумулюем усе меркаванні, пасля чаго будзем разглядаць іх яшчэ не адзін раз, — тлумачыць спікер. — Таму што мы павінны выйсці на рэферэндум з важкімі прапановамі ў самы важны закон, па якім будзем жыць.

Разам з тым, адзначае Наталля Качанава, трэба разумець, што ў развіцці Асноўнага Закона будзе прынята яшчэ больш чым сотня нарматыўна-прававых актаў. Таму што кожны артыкул прадугледжвае далейшае развіццё, якое знойдзе адлюстраванне ў адпаведных заканадаўчых актах.

Фота БелТА.

Трэба сказаць, што ініцыятыўная група з трох чалавек, якая трапіла на прыём, малая частка народна-патрыятычнага руху «Спектр», якая змагла асабіста пагутарыць з Наталляй Качанавай. Асноўная маса ахвотных чакала на ўваходзе грамадскай прыёмнай. Спікер верхняй палаты парламента спусцілася да людзей і паабяцала правесці сустрэчу ў хуткім часе ў Савеце Рэспублікі з тым, каб актывісты і патрыёты сваёй Айчыны маглі пазнаёміцца з дзейнасцю заканадаўчага органа і яго функцыямі бліжэй.

Свае каштоўнасці і прыярытэты

Старшыня вышэйшага кардынацыйнага савета саюза юрыдычных асоб «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва» Андрэй КАПЫТОК прыйшоў на прыём з прапановай па артыкуле 89-м, які датычыцца новага органа народаўладдзя — Усебеларускага народнага сходу. Ён паведаміў, што членамі арганізацыі з'яўляецца каля 40 тысяч суб'ектаў гаспадарання, таму лічыць неабходным прадугледзець і іх прадстаўніцтва ва УНС.

Наталля Качанава нагадзілася з тым, што рэсурс гэтай арганізацыі не вычарпаны і даручыла пры разглядзе пытанняў, якія закранаюць сферу прадпрымальніцкай дзейнасці, запрашаць прадстаўнікоў канфедэрацыі для ўдзелу ў экспертным савеце, створаным пры Савеце Рэспублікі.

Дзве пажылыя мінчанкі прыйшлі з прапановамі ў абарону сямейных каштоўнасцяў.

— У дзіцяці павінны быць матуля і тата, а не бацька № 1 і бацька № 2. Гэтыя чужыя каштоўнасці запаланілі планету. Але мы дома і самі вырашым, як нам жыць, — эмацыянальна выказалася Валянціна Фёдараўна.

З такім меркаваннем спікер верхняй палаты парламента цалкам згодна, бо традыцыйныя сямейныя каштоўнасці — прыярытэт у нашай дзяржаве. Акрамя таго, пытанням мацярынства і дзяцінства ў нашай краіне ўдзяляецца вельмі шмат увагі. І гэта прыносіць свае вынікі: колькасць шматдзетных сем'яў штогод павялічваецца.

Прапановы вітаюцца!

— Калі мы арганізавалі работу грамадскай прыёмнай пры Савеце Рэспублікі, я меркавала, што людзі прыйдуць не толькі з пытаннямі, якія датычацца Асноўнага Закона нашай краіны, але і са звычайнымі жыццёвымі пытаннямі. У прынцыпе так і атрымалася, — адзначыла ў гутарцы з журналістамі Наталля Качанава. — Але ў большай ступені пытанні датычыліся Асноўнага Закона нашай краіны.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла той факт, які ёй больш за ўсё імпануе: людзі глыбока вывучаюць праект Асноўнага Закона і прыходзяць з цікавымі прапановамі.

— Прычым па артыкулах называюць тыя моманты, якія выклікалі ў іх нейкі сумнеў, — акцэнтуе яна ўвагу.

Паводле ацэнкі спікера, яе парадавала і тое, што людзі ў асноўным падтрымліваюць палітыку, якая праводзіцца ў дзяржаве, высока ацэньваюць дасягненні нашай краіны і кажуць аб неабходнасці гэта ўсё захаваць.

— Гэта вельмі важна, — пераканана Наталля Качанава. — Гэта тое, над чым мы працавалі ўвесь гэты час, каб Асноўны Закон-праект быў для нас вызначальным. Бо па ім будуць жыць тыя, хто ідуць за намі — будучыя пакаленні. Таму, вядома, неабыякавых людзей вельмі шмат, і гэта радуе.

Звяртае ўвагу спікер верхняй палаты парламента і на тое, што людзі, сапраўды, нацэлены на канструктыўны дыялог:

— Я пачула, што людзі нацэлены на канструктыўную работу па абмеркаванні Асноўнага Закона нашай краіны, — кажа яна.

Адзначыла Наталля Качанава і пытанні, агучаныя сёння, якія датычацца звычайных будзённых праблем, што ёсць у кожнага.

— У большай ступені гэта жыллёвыя пытанні, будаўніцтва і эксплуатацыі жылога фонду, добраўпарадкавання населеных пунктаў, — паведаміла Наталля Качанава.

Яна падкрэсліла, што, нягледзячы на тэматыку зваротаў, людзей абавязкова выслухаюць і над іх пытаннем будуць працаваць адказныя спецыялісты.

— Таму што палітыка, якая праводзіцца ў нашай краіне, нацэлена на кожнага чалавека. Калі ў чалавека ёсць пытанні, якія сёння перашкаджаюць яму жыць, вядома, мы павінны выслухаць і зрабіць усё, каб аказаць яму садзейнічанне ў вырашэнні гэтага пытання, несумненна, у рамках закона, — рэзюмавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Актыўна і канструктыўна!

Пасля работу ў грамадскай прыёмнай працягнуў намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Леанід ЗАЯЦ. Такім чынам, заяўнікі мелі магчымасць агучыць свае прапановы членам Савета Рэспублікі на працягу ўсяго дня.

— Вельмі шмат змяненняў і дапаўненняў уносіцца ў Асноўны Закон, па якім трэба жыць нашай дзяржаве. Новаўвядзенні, прапісаныя ў праекце Канстытуцыі, прадыктаваны палітычнымі, грамадска-эканамічнымі ўмовамі, якія ствараліся гадамі і адлюстроўваюць рэальную рэчаіснасць, — акцэнтаваў увагу Леанід Заяц. — У цяперашні час на этапе развіцця нашага грамадства і дзяржавы неабходна гэтыя змены замацаваць у Асноўным Законе.

Ён нагадаў аб тым, што Прэзідэнт краіны не раз акцэнтаваў увагу на неабходнасці ўдасканалення Канстытуцыі. У выніку была створана Канстытуцыйная камісія, па ўсёй краіне дзейнічала больш за паўтары тысячы дыялогавых пляцовак, удзельнікамі якіх стала каля 50 тысяч грамадзян, што прадстаўлялі розныя слаі грамадства.

— Людзі прыходзілі з разумнымі прапановамі і ідэямі, каб усё гэта было пачута і дапоўнена ў Асноўны Закон, — кажа віцэ-спікер верхняй палаты парламента.

Ён адзначыў, што беларусы актыўна ўдзельнічаюць у абмеркаванні новай рэдакцыі Канстытуцыі.

— Мы назіраем актыўную рэакцыю грамадзян, якія выказваюць свае прапановы па Асноўным Законе. Неабходна пачуць людзей, сфармуляваць дапаўненні і змяненні ў праект Канстытуцыі такім чынам, каб гэта далей аб'ядноўвала нашых людзей, забяспечвала грамадзянскі мір на беларускай зямлі, салідарнасць грамадства і далейшае эканамічнае развіццё краіны, — падкрэсліў Леанід Заяц.

Віцэ-спікер звярнуў увагу на тое, што навацыі закрануць многія аспекты жыццядзейнасці грамадзян. У прыватнасці, у артыкуле 32 шлюб замацоўваецца як саюз жанчыны і мужчыны, пад абаронай дзяржавы знаходзяцца сям'я, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства.

— Устанаўліваюцца пэўныя правы і абавязкі, — тлумачыць парламентарый. — Бацькі павінны клапаціцца пра дзяцей, іх адукацыю, прывучаць іх да грамадска карыснай працы, вучыць дзіця шанаваць гістарычныя і нацыянальныя традыцыі, паважаць законы краіны, увогуле, падрыхтаваць да дарослага жыцця. А дзеці, у сваю чаргу, павінны клапаціцца аб сваіх бацьках і аказваць ім дапамогу.

Віцэ-спікер акцэнтаваў таксама ўвагу на артыкуле 47, згодна з якім дзяржава праяўляе асаблівы клопат аб ветэранах вайны і працы, аб асобах, якія страцілі здароўе пры абароне дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, а таксама аб інвалідах і пажылых людзях. У прыватнасці, інвалідам забяспечваюцца роўныя магчымасці для ажыццяўлення правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Акрамя таго, рэалізоўваецца палітыка сацыяльнай інтэграцыі інвалідаў, стварэння даступнага асяроддзя і паляпшэння якасці іх жыцця, падтрымкі сем'яў з інвалідамі.

У гэты дзень да віцэ-спікера прыходзілі не толькі з прапановамі па праекце новай Канстытуцыі (у прыватнасці, агучвалі ідэі па дзейнасці Усебеларускага народнага сходу, судаўладкавання, мясцовага кіравання і самакіравання), але і агучвалі свае жыццёвыя праблемы. Усе тэмы ўзяты на кантроль. А грамадзянам, якія агучвалі канструктыўныя прапановы, падзякавалі за актыўную пазіцыю.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Вольга АНУФРЫЕВА.

Захаваць традыцыі — захаваць краіну

Расповед аб грамадскай прыёмнай пры Савеце Рэспублікі будзе няпоўны, калі не згадаць і аб тым, што ў першай палове дня, з-за вялікай колькасці ахвотных трапіць на прыём да членаў Прэзідыума, дапамагаў калегам у прыёме старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ.
Як расказалі ў профільнай камісіі, людзі ў асноўным звярталіся з прапановамі па дапаўненні Асноўнага Закона краіны, а таксама па асабістых пытаннях.

— Імпануе, што Канстытуцыя абапіраецца на нацыянальныя духоўныя традыцыі нашага народа. Асобна кіраўніком выдзелены Усебеларускі народны сход. І, я думаю, што гэтым падкрэслена важнасць народаўладдзя ў нашай краіне. Мяне радуе, што ёсць нацэленасць на захаванне сям'і. Захаваць гэтыя традыцыі або пераемнасць пакаленняў і перадаць іх моладзі, нашым дзецям — гэта значыць, захаваць сваю краіну, — падзяліўся меркаваннем парламентарый.

Старшыня профільнай камісіі таксама падкрэсліў, што ў праекце Канстытуцыі захаваны сацыяльныя гарантыі.

— Адукацыя, медыцына — высокай якасці і даступныя для кожнага. Дзяржава прадугледзела і гэтыя пазіцыі. Але чакае і крокаў у адказ, — рэзюмаваў Міхаіл Русы.

Сядзі і глядзі

ЦІ ПРЫВЯДУЦЬ ДА ПЕРАМОГІ ВЕДЫ?

Пяты сезон сямейнай шоу-віктарыны «Я ведаю!» Белтэлерадыёкампаніі стартуе 15 студзеня на тэлеканале «Беларусь 1». У першым выпуску гледачоў чакае інтэлектуальнае спаборніцтва сярод вучняў пятых класаў.

Новы сезон шоу выйдзе ў эфір пад знакам пяцігадовага юбілею і захавае ўсё найлепшае, за што віктарына выхаднога дня палюбілася шматлікай аўдыторыі ў мінулыя гады. Амбіцыйныя і цікаўныя школьнікі, ліцэісты і кадэты з розных рэгіёнаў Беларусі паспяхова прайшлі папярэдні адбор і зусім хутка будуць прадстаўляць родныя навучальныя ўстановы на тэлевізійным праекце рэспубліканскага маштабу. Пацвярджаць свае веды ім цяпер трэба на практыцы — за трыбунамі ўдзельнікаў.

«Да новага сезона, нашай пятай гадавіны ў эфіры, мы прыйшлі з праверанымі рэйтынгамі і яшчэ больш цікавымі задачкамі, карысным падарункамі для ўдзельнікаў і сюрпрызамі для ўсіх тэлегледачоў, — расказвае **выканаўчы прадзюсар праекта Вольга ШЛЯГЕР.** — У рабоце дзецьмі і падлеткамі нам важна захоўваць добразычлівую атмасферу на здымачнай пляцоўцы, не хваляваць іх аб'ектывамі тэлекамер, а наадварот, падтрымліваць пры неабходнасці і дзяліць з імі радасць першых перамог. Мы чарговы раз выказваем пашану беларускім педагогам і паказваем на ўсю краіну вынік іх карпатлівай работы. А ўсё разам — гэта складнікі простай формулы «Я ведаю!», якой наша каманда прытрымліваецца з году ў год».

І пакуль у «настаўніцкай» разам з педагогамі сачыць за вучнямі будзе Юлія Пярцова, суправаджаць іх па лабірынтах ведаў — місія для нязменнага вядучага Георгія Калдуна. Каверзныя пытанні і галаваломкі, распрацаваныя сумесна з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, не абмяжоўваюцца толькі школьнымі праграмамі і ахопліваюць розныя сферы навукі, культуры, мастацтва і спорту, а таму будуць адналькава цікавыя як для дзяцей, так і для дарослых.

Імёны сямі пераможцаў віктарыны — па адным у кожнай паралелі 5—11 класаў — тэлеаўдыторыя даведаецца вясной. А сачыць за ўдзельнікамі пятага сезона зможам кожныя выхадныя ў эфіры «Беларусь 1». Яркія фрагменты эфіраў і тое, што засталося па-закадрам, можна будзе знайсці ў афіцыйным «Інстаграм»-акаўнце шоу @ya_znayu_b1. Не прапусціце першы выпуск юбілейнага сезона ўжо ў гэтую суботу ў 13.35 — альбо шукайце запісы праекта на сайце медыяхолдынга ці на «Ютуб»-канале «Беларусь 1».

Фота Белтэлерадыёкампаніі.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 137

Падведзены вынікі міжнароднага тэматычнага конкурсу складання двухходовых задач, які праводзіў шахматны бюлетэнь «Альбіна» (пра яго ўмовы мы расказвалі ў выпуску № 129). 14 аўтараў з Беларусі, Расіі, Украіны, Славакіі і ЗША даслалі 28 твораў. Арбітр Міхаіл Храмцэвіч адзначыў 16 кампазіцый.

Першы прыз — Павел Мурашоў (Расія).

Белыя: Крe7, Фh1, Лc4, Лg2, Cb5, Се3, Ка6, Kf3 (8).

Чорныя: Крd5, Лb2, Се2, Ch2, Ка8, пп. b4, b7, e5 (8).

Спачатку гатовая гульня 1... e4 2. Лd4, Лc5x Не вядуць да мэты спробы: 1. Лg8? ~ 2. Лd8x, 1...Kb6 2. Кc7x, але 1...C:c4!; 1. Лg5? ~ 2. Лd4x, 1...C:c4 2. Kd2x, 1...Лd2 2. K:b4x, але 1...ba!; 1. Kg5? ~ 2. Лc5x, 1...C:c4 2. Лd2x, 1...Лc2 2. K:b4x, але 1...b6! Вырашае 1. Kd2! ~ 2. Лc5x, 1...C:c4 2. Лg5x, 1...b6 2. Сc6x (1...Лc2, Л:d2 2. K:b4x). Другі прыз — Рауф Аліеўсадзадэ і Данііл Якімовіч (ЗША); трэці прыз — Золтан Лабаі (Славакія); спецпрыз (за мініяцюру) — Р. Аліеўсадзадэ (ЗША) (гл. дыяграму).

Белыя: Крe1, Фc7, Лb1, Лh1, Кc6 (5).

Чорныя: Крc5, Cg8 (2).

Мат за 2 хады.

Блізня: белы ферзь не на c7, а на d8.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

Ганаровыя водгукі: першы — Чэслаў Якубоўскі (Беларусь); другі — Пётр Навіцкі (Украіна); трэці — Мікалай Бельчыкаў, Вячаслаў Красічонак і Віктар Волчак (Беларусь); чацвёрты — Р. Аліеўсадзадэ і Д. Якімовіч (ЗША); пяты — П. Навіцкі (Украіна); шосты — Яўген Гаўрылаў (Украіна).

Пахвальныя водгукі: першы — П. Мурашоў (Расія); другі — Д. Якімовіч (ЗША); трэці — Я. Гаўрылаў (Украіна); чацвёрты — Ч. Якубоўскі (Беларусь); пяты — Міхаіл Кошаль і Ч. Якубоўскі (Беларусь); шосты — Мікалай Быкаў (Беларусь).

* * *

У Сербіі ў канцы снежня адбыўся юнацкі чэмпіянат Еўропы па хуткіх шахматах (рапідзе) і бліцы. Нашы суайчыннікі заваявалі 24 медалі: 8 залатых, 9 сярэбраных і 7 бронзавых.

У рапідзе Аляксандра Тарасенка перамагла сярод дзяўчат да 18 гадоў, а Насця Севасцянчук — сярод дзяўчынак да 8 гадоў. Сярэбраныя медалі атрымалі Варвара Мацкевіч (да 10 гадоў), Ксенія Зелянцова (да 16 гадоў), Арцём Стрыбук (да 14 гадоў) і Максім Царук (да 16 гадоў), бронзавыя — Дамір Булгак (да 8 гадоў), Маргарыта Бендзік (да 12 гадоў) і Ксенія Норман (да 14 гадоў).

У камандным заліку залатыя медалі заваявалі беларускія зборныя да 18 гадоў (Дзяніс Лазавік, Максім Царук, Ягор Сіліч, Аляксандра Тарасенка) і да 14 гадоў (Арцём Стрыбук, Міхей Навуменка, Аляксандр Гвоздзь, Ксенія Норман).

У бліцы чэмпіёнамі Еўропы ў сваіх узроставых групах сталі Аляксандра Тарасенка, Ксенія Зелянцова, Арцём Стрыбук. Сярэбраныя медалі атрымалі Дзяніс Лазавік, Ягор Сіліч, Варвара Мацкевіч, бронзавыя — Насця Севасцянчук, Дамір Булгак і Міхей Навуменка.

У чэмпіянаце па рашэнні шахматных задач Аляксандра Тарасенка заваявала залаты медаль (да 18 гадоў), Максім Царук і Арцём Стрыбук — сярэбраныя (адпаведна да 18 і 14 гадоў), Насця Севасцянчук — бронзавы (да 10 гадоў).

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. d4 Kph5 2. Фd3, 1... Крg4 2. e4+. Першыя правільна адказалі Фёдар Карпей, Васіль Жуковіч, Уладзімір Барысёнак, Ігар Ананіч, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч, Віктар Жук.

Вадзім ЖЫЛКО.

Слухай сваё

НА ХВАЛІ САПРАЎДНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ

Ужо 20 гадоў радыёканал «Культура» распавядае аўдыторыі пра ўвесь спектр жанраў, відаў і ўзораў духоўнай спадчыны, сучаснага нацыянальнага і сусветнага мастацтва. І дэвіз яго застаецца нязменным — «Мы выбіраем вечныя каштоўнасці». Бягучы год для спецыялізаванай радыёхвалі Белтэлерадыёкампаніі будзе багаты на падзеі, новыя праекты і сустрэчы. Пра гэта мы больш падрабязна распыталі ў яе дырэктара Уладзіміра ТРАПЯНКА.



Аматараў эфіру канала «Культура» прыцягваюць душэўнасць, цеплыня, адметная падача вядучых, а таксама пазнавальнае музычнае афармленне. У калектыве працуюць спецыялісты ў розных галінах мастацтва — кампазітары, паэты, акцёры, рэжысёры, музыка- і мастацтвазнаўцы, а таксама вопытныя і маладыя журналісты, чые імёны палюбіліся слухачам.

Новаўвядзенні закрануць і патрабаванні да кандыдата ў прэзідэнты: ён не павінен мець ні на бягучы момант, ні раней грамадзянства замежнай дзяржавы або віду на жыхарства, або іншага дакумента замежнай дзяржавы, які дае права на льготы і іншыя перавагі.

Усебеларускі народны сход як орган народаўладдзя атрымае новыя грані. Гэта закране і дэлегатаў, і паўнамоцтвы УНС, і рашэнні, якія прымаюцца ім. УНС зможа прапаноўваць змены і дапаўненні ў Канстытуцыю, а таксама правядзенне рэспубліканскіх рэферэндумаў, мае права разглядаць пытанне аб легітымнасці выбараў, уводзіць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь надзвычайнае або ваеннае становішча.

Зараз усім грамадзянам нашай краіны абавязкова трэба азнаёміцца з абнаўленнямі ў Канстытуцыі. І на лютаўскім рэферэндуме запусціць працэс перазагрузкі ў дзяржаўнасці, грамадстве і жыцці Беларусі.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 13 студзеня 2022 года.

Кацярына ДУБІНСКАЯ:

«Настаўнік — не проста чалавек, які стаіць каля дошкі»

З носьбітамі гэтай прафесіі ўсе сустракаюцца з дзяцінства, назіраюць за іх працай, а некаторыя бяруць за прыклад і пераймаюць. А ёсць тыя, каму выпадае матэрыялізаваць павагу да настаўнікаў ад імя грамадства. Гэта робяць у тым ліку і журналісты, якія працуюць у спецыялізаваных выданнях для настаўнікаў і вучняў. Выдавецкі дом «Педагагічная прэса» некалькі месяцаў жыве ў плыні пераўтварэнняў, задуманых цяперашнім дырэктарам, галоўным рэдактарам Кацярынай Дубінскай, якая да гэтага ўзначальвала інфармацыйнае агенцтва «Минск-новости». Наша размова аб перспектывах спецыялізаваных выданняў для настаўнікаў.

— У «Педагагічную прэсу» вы прыйшлі з грамадска-палітычнай. Адчулі розніцу?

— Так, і магу прызнацца, што перад Новым годам я практычна пазбавілася сну, таму што чакала вынікаў падпіскі. А калі прыйшлі лічбы, зразумела, што мы не толькі захавалі тыраж у параўнанні з мінулым годам, але нават трошкі і павялічылі, гэта дазволіла ўздыхнуць з палёгкай і ў адносінах да астатніх СМІ, якія таксама ўваходзяць у выдавецкі дом «Педагагічная прэса». Але нельга расслабляцца, таму што падпіска тут працягваецца кожны месяц...

Менавіта таму перамены ў выдавецкім доме «Педагагічная прэса» патрэбны, іх дыктуе час. Напачатку трэба было абнавіць дызайн, і ўжо ў пачатку лістапада выйшла абноўленая «Настаўніцкая газета». Найперш павялічылі шрыфт, каб чытачу было лягчэй успрымаць тэксты. З'явіліся новыя рубрыкі, новыя праекты і крыху грамадска-палітычнай тэматыкі. У большай ступені проста грамадскай. Мяне тут не ўсе падтрымалі, лічачы, што «Настаўніцкая газета» павінна несці практычную карысць настаўнікам: педагогіка, метадычныя распрацоўкі, адукацыйныя праекты па рэгіёнах. Безумоўна, гэта галоўнае. Але для мяне педагог заўсёды быў чалавекам з вялікай літары, і яму цікавыя і матэрыялы пад рубрыкай «Духоўнасць», і тыя, дзе героямі выступаюць людзі іншых прафесій. У нас з'явіліся аўтарскія калонкі. Услед за мной з радасцю пішуць калонкі намеснікі галоўнага рэдактара, з'явілася аўтарская калонка дырэктара гімназіі.

Хвалююся, калі не бачу ў газеце матэрыялаў, падпісаных нашымі галоўнымі аўтарамі — настаўнікамі, класнымі кіраўнікамі, метадыстамі, бібліятэкарамі. Напрыклад, у нас ёсць рубрыка «Адукацыя у асобах», якая пачынаецца з фота на першай паласе — тэкст, як правіла, пішуць самі настаўнікі пра сваіх калег.

— Перспектывы выданняў звязаныя з маладымі чытачамі...

— Таму вялікая ўвага маладым: трэба разумець, хто ідзе на змену дасведчаным педагогам. Пры гэтым падчас сустрэч на ўніверсітэтах, дзе рыхтуюць будучых настаўнікаў, мяне ўразіў той факт, што там вельмі абмежавана прадстаўлена «Настаўніцкая газета». А калі будучыя педагогі не ведаюць сваю газету цяпер, а потым прыйдуць у школу, то рана ці позна можа быць страчана сувязь выдання з аўдыторыяй. Ды і сувязь розных пакаленняў настаўнікаў таксама... Таму вырашылі правесці анкетаванне сярод студэнтаў — будучых настаўнікаў, каб высветліць: пра што ім цікава чытаць, якія тэмы хвалююць, які досвед цікавы. Важна разумець, якім чынам газета можа адказваць на іх запыты.

Зразумела, што ў наш час усе маюць гаджэты і без інтэрнэту нікуды. Але газету я сёння бачу як вельмі даходлівага памагатага, мусіць, больш усё ж такі ў рэгіёнах. Мінск складаны для друкаваных выданняў, прызнаю гэта, нягледзячы на тое, што гэта мой родны горад. Але тут больш інфармацыі, вышэйшыя інтэнсіўнасць і рытм жыцця. А ў рэгіёнах больш яскрава выяўляецца цікавасць да жыцця, да людзей, якія побач.

— Новыя пакаленні цяпер асвойваюць новыя фарматы СМІ. Ці карыстаецеся гэтымі магчымасцямі?

— У «Настаўніцкай газеты» яшчэ нядаўна не было свайго тэлеграм-канала. Цяпер ён у нас ёсць і мае падпісчыкаў, праўда, пакуль нам далёка да той колькасці, што ў Міністэрства адукацыі. Але было цікава даследаваць якасць гэтай аўдыторыі. Мы правялі апытанне, і аказалася, што і ў тэлеграм-канале не асабліва былі прадстаўлены маладыя педагогі. Былі дырэктары школ, настаўнікі з досведам. А маладыя... Гэта для мяне як задача, якую я пакуль вырашыць не змагла: загадкавыя маладыя людзі, да якіх патрэбен асаблівы падыход. Напрыклад, у нас выходзяць матэрыялы па методыцы ўрокаў — на іх адгукаецца шмат маладых аўтараў. Калі пра іх пішуць, пра іх раён, пра іх знаёмых, то, магчыма, такім чынам яны далучаюцца, пачынаюць нешта чытаць і глядзець. Таму патрэбна доўгая, эвалюцыйная праца...

— Пад дахам выдавецкага дома «Педагагічная прэса» шэраг выданняў. Калі «Настаўніцкая газета» нядрэнна адчувае сябе ў друкаваным варыянце, то што наконт іншых?

— Так, ёсць і асаблівыя клопаты. Напрыклад, часопіс «Спорttime» прыгожы, але зусім не раскручаны. Гэта наш сацыяльны праект, і, спадзяюся, яго патэнцыял здолее раскрыць новы галоўны рэдактар. У канцэпцыі прасоўвання гэтага выдання будзе зроблены акцэнт на дзіцяча-юнацкі спорт.

Ёсць асаблівая газета «Дадому» для замяшчальных сем'яў, я і не падазравала аб яе існаванні да прыходу сюды, таму што выданне спецыфічнае. Тыраж больш за тысячу, але важна, што газету атрымліваюць прыёмныя сем'і і дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Усё, што важна для іх, трапляе ў поле зроку журналістаў. Натуральна, і акцыя «Нашы дзеці» ў нас прайшла ў сацыяльна-педагагічным цэнтры, куды малых змяшчаюць на шэсць месяцаў перад тым, як вярнуць бацькам ці знайсці прыёмную сям'ю. Я на свае вочы ўбачыла ў Слоніме дзіцячы прытулак, пачула словы педагогаў аб тым, як патрэбна ім газета, што працягвае ўвагу да вырашэння складаных праблемы. Гэта таксама сацыяльны праект, які не можа акупляцца фінансава, але мы адчуваем маральную адказнасць за выхад газеты.

Трэба прызнаць, што давялося прымаць і непапулярныя рашэнні. Газета «Пераходны ўзрост» перастала існаваць як самастойнае выданне, пры гэтым пастараліся захаваць самую тэматыку, кожны тыдзень будзем выпускаць дадатак — разварот у «Настаўніцкай газеце». Баюся, у свой час былі згублены магчымасці перафарматавання гэтай газеты, верагодна, трэба было стварыць на яе аснове інтэрнэт-праект для падлеткаў.

— Мяркую, спецыялізаванай прэсе сёння лягчэй, бо ёсць дакладнае разуменне аўдыторыі і яе патрэб...

— На мой погляд, галоўная ўвага павінна быць да асобы настаўніка, і ў нас зроблены акцэнт на гэта ў розных рубрыках, у розных праектах. Я ні адну рубрыку не закрыла, але прапанавала крыху пашырыць гарызонты. Бо настаўнік — не проста чалавек, які стаіць каля дошкі. Ды і сама прафесія выходзіць за межы школы. Настаўнік — гэта і чалавек, які вядзе выяўленчую студыю, куды прыходзіць шмат дзяцей, альбо балерына Вялікага тэатра, якая знаёміць з харэаграфіяй маленькіх дзяўчынак. Ды часам быць настаўнікам — гэта больш, чым прафесія, гэта наканаванне.

Добры настаўнік і веды дае, і выхоўвае. Так я магу сказаць пра свайго настаўніка матэматыкі Аляксандра Маркавіча Фельдмана. Яму ўжо за 80 гадоў, а ён да гэтага часу выкладае матэматыку ў 19-й школе Мінска. Ён выхоўвае не толькі любоў да свайго прадмета — выхоўвае любоў да жыцця. Сёння ўсё часцей успамінаю сваіх настаўнікаў — класнага кіраўніка Марыю Васільеўну, настаўніцу рускай мовы Святлану Сцяпанаўну, настаўніцу фізікі Галіну Пятроўну, прытым, што фізіку я не вельмі любіла, але ўсё роўна яе ведала... Сваім прыкладам, сваімі адносінамі да жыцця яны паўплывалі на мяне. Упэўнена, і сёння такіх настаўнікаў шмат.

Сёлета з'явіўся ў школе новы прадмет — пра духоўнасць і патрыятызм, цяпер гэта факультатыў. А вядуць яго людзі, якія займаюцца выхаваннем чалавека. Ведаю, ва ўсіх школах Першамайскага раёна Мінска вучні 5-х класаў з задавальненнем пайшлі на яго... Сярод герояў нашых публікацый шмат бліскучых асоб, якія ведаюць, як выхаваць асобамі сваіх вучняў. Такія настаўнікі не спыняюцца ў развіцці, іх цікавасці выходзяць за межы прадметаў. Дзеля іх хочацца ставіць амбіцыйныя задачы перад рэдакцыяй, пашыраць тэматыку, адкрываць змястоўныя праекты.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Надвор'е

Ураганны вецер і мокры снег з дажджом

У гэтыя выхадныя істотна пацяплее

Кантраснае ў нас надвор'е гэтай зімой. То мароз на ўсходзе краіны, які ўначы дасягаў мінус 24 градусаў, то на наступны дзень цёплы вецер з Атлантыкі нясе адлігу і да плюс 4 градусаў. І такія тэмпературныя «арэлі» будуць у нас пастаянна ў гэты халодны сезон, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Умовы надвор'я рэзка зменяцца ўжо ў пятніцу, калі ў многіх раёнах чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Таму ў другой палове дня на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. На большай частцы тэрыторыі прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с, а месцамі — 21—24 м/с. Максімальная тэмпература паветра складзе 1—7 цяпла.

У суботу месцамі, пераважна па паўночна-ўсходняй частцы тэрыторыі, пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег і мяцеліца. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. На большай частцы тэрыторыі Беларусі прагназуецца ўзмацненне паўночна-заходняга ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да плюс 2, удзень — ад 2 марозу да 3 цяпла.

А ў нядзелю анамальнае цяпло ўжо будзе сыходзіць з тэрыторыі нашай краіны. У гэтыя суткі па крайнім усходзе краіны ўначы пройдзе невялікі кароткачасовы снег, удзень пераважна па паўночным захадзе чакаюцца ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Месцамі будзе назірацца слабы галалёд. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 марозу, удзень — ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла.

Згодна з доўгачасовым прагнозам айчынных сіноптыкаў, ветранае надвор'е чакаецца і ў пачатку наступнага тыдня. У панядзелак часам прагназуюцца ападкі з пераважна мокрага снегу. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Месцамі адбудзецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да плюс 2 градусаў, удзень — ад 2 марозу да 3 цяпла. Праўда, ужо ў аўторак пойдзе снег і ўсталюецца слабамарознае надвор'е.

Сяргей КУРКАЧ.

Ведай нашых!

ПІСАЦЬ ПРА НАВУКУ ТРЭБА ЎМЕЦЬ...

Нацыянальная акадэмія навук падвяла вынікі конкурсу на найлепшае прадстаўленне навуковых дасягненняў 2021 года ў сродках масавай інфармацыі. У ліку пераможцаў і журналіст «Звязды».

Конкурс праводзіўся па чатырох намінацыях. «Найлепшая публікацыя», «Найлепшае прадстаўленне дасягненняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў сетцы Інтэрнэт», «Найлепшы сюжэт (праграма) на радыё і тэлебачанні» і «Найлепшая публікацыя ў навукова-папулярным выданні». Па кожнай з намінацый прысуджаны тры прэміі.

У прыватнасці, у намінацыі «Найлепшая публікацыя» бюро Прэзідыума НАН Беларусі прыняло рашэнне прысудзіць прэміі конкурсу рэдактару аддзела газеты «Звязда» Надзеі НІКАЛАЕВАЙ — за цыкл матэрыялаў аб дасягненнях Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; аглядальніку рэдакцыі газеты «Рэспубліка» Веры АРТЭАГА — за цыкл артыкулаў аб укладзе вучоных НАН Беларусі ў развіццё беларускай навукі і аглядальніку часопіса «Веснік Белнафтахіма» Наталлі НІЯКОЎСКАЙ — за цыкл артыкулаў аб ролі беларускай навукі ў жыцці грамадства.

У намінацыі «Найлепшае прадстаўленне дасягненняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў сетцы Інтэрнэт» прэміі прысуджаны карэспандэнту аддзела эканамічнай і навуковай інфармацыі галоўнай рэдакцыі інфармацыі БелТА Валерыі ГАЎРЫЛАВАЙ — за цыкл матэрыялаў аб дзейнасці НАН Беларусі; рэдактару аддзела рэдактараў дырэкцыі падрыхтоўкі тэлепраграм генеральнага прадзюсарскага цэнтра Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Арыне МАРЫНАВАЙ — за цыкл матэрыялаў аб укладзе беларускай навукі ў развіццё грамадства на сайце Белтэлерадыёкампаніі і на YouTube-канале тэлеканала «Беларусь 1»; спецыяльнаму карэспандэнту карэспандэнцкага пункта Федэральнага дзяржаўнага ўнітарнага прадпрыемства «Міжнароднае інфармацыйнае агенцтва «Расія сёння» ў Рэспубліцы Беларусь» Станіславу АНДРОСІКУ — за цыкл матэрыялаў аб укладзе вучоных НАН Беларусі ў развіццё грамадства.

У конкурсе маглі ўдзельнічаць як прафесійныя журналісты, так і непрафесійныя аўтары, папулярызатары навукі. У 2021 годзе на конкурс было прадстаўлена 108 работ 25 аўтараў. Узнагароджанне лаўрэатаў будзе прымеркавана да Дня беларускай навукі.

Ул. інф.

Управляющий по делу о банкротстве ООО «КовалевТранс» – ООО «Управляющая компания «Экстраюст»» – организатор торгов извещает о проведении открытых торгов в форме аукциона, который состоится 31.01.2022 в 12.00 по адресу: Минская область, Минский район, район деревни Озерцо, здание администрации автомобильного рынка, каб. 301, по реализации имущества ООО «КовалевТранс», а именно дебиторской задолженности:

№ лота п/п	Наименование имущества, выставляемого на торги (бел. руб.)	Начальная цена, без НДС бел. руб.
	Первые повторные торги	
1	ОАО «Лунинецлес» в сумме 7239,40	7239,40
	Третьи повторные торги	
1	ОАО «Молодечненский завод металлоконструкций» (УНП 600136845) в сумме 2 724,64 руб.	1362,32
2	ОАО «Бельковщина» (УНП 300061673) в сумме 14 172,69 руб.	7086,35
3	ООО «Вилейское агропромэнерго» (УНП 600010743) в сумме 5273,40 руб.	2636,70
4	ДУП «ПМК-218» УП «Минскоблсельстрой» (УНП 690019246) в сумме 234,08 руб.	117,04
5	ДСУП «ПМК-182» (УНП 690018954) в сумме 4290,58 руб.	2145,29
6	Государственное унитарное предприятие «Мядельское ПМС» в сумме 6608,72 руб.	3304,36
7	Открытое акционерное общество «Белсантехмонтаж-2» в сумме 720,96 руб.	360,48
8	Открытое акционерное общество «Экспериментальная база «Дашковка» в сумме 474,49 руб.	237,25
9	Общество с ограниченной ответственностью «БелМолд» в сумме 170,84 руб.	85,42
10	Частное строительное унитарное предприятие «ВАЕНГА» в сумме 1 082,27 руб.	541,14
11	ЧТУП «Белспецпромсофт» ликвидация в сумме 2 691,23 руб.	1345,62
12	ОАО «ПМК-16-Агро» в сумме 2 713,17 руб.	1356,59

Шаг аукциона 5 процентов.

Заявки на участие принимаются **с 9.00 до 17.00 с 14.01.2022 по 28.01.2022** по адресу: 220026, г. Минск, а/я 81 или по e-mail: **istext.upr@mail.ru** (тел. для справок +375 (29) 669-74-69, Инна).

До подачи заявки необходимо внести задаток в размере 5 процентов от стоимости выбранного имущества (лота) на расчетный счет ООО «КовалевТранс» (УНП 491327139) на р/с BY91IRJS30120138201000000933 в ОАО «СтатусБанк» г. Минск, БИК IRJSBY22.

Победителем торгов является участник, предложивший наибольшую цену за предлагаемый к продаже лот. Договор купли-продажи заключается с победителем торгов в течение семи рабочих дней с даты проведения аукциона на сумму лота в размере долга, не погашенного на дату заключения договора. Победитель торгов в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену лота за минусом внесенного задатка.

Участникам, не признанными победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 рабочих дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Лица, подавшие заявки на участие в торгах, имеют право отказаться от участия в торгах. В случае признания торгов несостоявшимися в виду подачи заявления на участие только одним участником, возможна продажа данного лота заявившемуся участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Центр Промышленной Оценки
• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Белшина», г. Бобруйск, ш. Минское, 4**

Предмет аукциона

Наименование	Общая площадь	Инвентарный номер
Лот № 1 Месторасположение: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1А		
Здание заводоуправления	2 935,2 кв. м	730/С-12820

В состав лота входят следующие сооружения: **подъездная дорога** (1234 кв. м, инв. № 730/С-17065); **ограждение** (240 кв. м, инв. № 730/С-17063); **ограждение** (148 кв. м, инв. № 730/С-17062); **участок канализации** (97,8 м, инв. № 730/С-17060); **ввод водопровода** (9,7 м, инв. № 730/С-17061)

Сведения о земельном участке: пл. **1,0277 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 20.08.2065) для обслуживания здания заводоуправления

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 193,20 бел. руб. (снижена более чем на 90 %)

Лот № 2 Месторасположение: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1/1

Незавершенное законсервированное капитальное строение (здание административно-хозяйственное)	7 458 кв. м	730/U-15754

Сведения о земельных участках: пл. **0,3478 га**, **0,0005** и **0,0005 га,** предоставлены продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 38,40 бел. руб. (снижена более чем на 90 %)

Задаток **в сумме по лоту № 1 – 193,20 бел. руб., по лоту № 2 – 38,40 бел. руб.** перечисляется на р/с BY47BELB301200285000 30226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнуто договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **по лоту № 1 – 2 %, по лоту № 2 – 1 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 05.10.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона – 28.01.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.01.2022 до 17.00 по указанному адресу

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703**
Продавец	**ЗАО «Белтехнология и М», г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70. Тел. +375 29 6139869**

Предмет аукциона

Адрес: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/12
Лот № 1

Наименование	Общ. пл.	Инв. номер
Производственно-складское помещение	893,9 кв. м	500/D-798186687
Складское помещение	1127,4 кв. м	500/D-798186686

В состав лота входит оборудование: перечень см. на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by)

Сведения о земельном участке по лоту № 1: пл. **0,8393 га,** предоставлен продавцу на праве общего долевого постоян. пользования (доля: 9/20). ***Ограничения (обременения) прав:*** охран. зоны линий связи и радиофикации (пл. 0,0883 га), электрич. сетей (пл. 0,1015 га), сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,4060 га) и канализации (пл. 0,0580 га)

Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 652 291,98 дол. США
Шаг аукциона – 32 614,60 дол. США

Лот № 2

Ограждение бетонное (инв. номер 980773)

Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 3 976,78 дол. США
Шаг аукциона – 198,84 дол. США

Адрес: г. Минск, пр-т Пушкина, 70
Лот № 3

Административное, производственное	2007,2 кв. м	500/C-21619

В состав лота входит оборудование: перечень см. на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by)

Сведения о земельном участке по лоту № 3: пл. **0,3600 га,** предоставлен продавцу на праве постоян. пользования. ***Ограничения (обременения) прав:*** охранные зоны технич. водопровода (пл. 0,0883 га), газофикации сред. давления (пл. 0,0414 га)

Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 836 429,84 дол. США
Шаг аукциона – 41 821,49 дол. США

Лот № 4

В состав лота входят: **домик-сторожка** (инв. № 2), **ограждение из металлич. сетки** (инв. № 4), **ворота самонесущие с электромехан. приводом и калиткой** (инв. № 5), **теплотрасса** (инв. номер 30121)

Начальная цена лота № 4 (с НДС 20 %) – 3 906,60 дол. США
Шаг аукциона – 195,33 дол. США

Лоты №№ 5–20 – оборудование, бывшее в употреблении Месторасположения: г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70

Лот №	Наименование	Инвен. №	Начальная цена (с НДС 20 %), дол. США	Шаг аукциона*, дол. США
5	Аппарат гидроабразив. резки	70103	41 929,29	2 096,46
7	Вертик. обрабат. центр с ЧПУ ECO CENTER 350 CNC с системой упр. GPPlus 450	70089	15 512,40	775,62
8	Обрабат. центр(Si) Vector1500 CNC*CNC	41031	36 271,15	1 813,56
9	Полуав-т для пайки дорож. резцов модели АПЗ-124	70124	41 220,12	2 061,01
10	Полуавтомат для пайки дорож. резцов модели АПЗ-4	41028	29 877,12	1 493,86
11	СТАН СП-2000	41008	79 800,00	3 990,00
14	Техн. линия по производ. путев. шуруп. на базе стана попереч.-клин. с инд. нагрев. SPL2500-2-IH-133	70179	571 769,28	28 588,46
16	Токар. станок с ЧПУ Fanuc Oi-Mate с накладной станиной Compact 330	41034	16 743,00	837,15
17	Широкоуниверс. фрез. станок с УЦИ ZX 635ОС	41025	3 473,81	173,69
18	Станок консольно-фрез. ВМ127М	41019	5 956,96	297,85
19	Станок отрезной ДОС	41012	199,45	9,97
20	Станок Hedelius-CB 80 Magnum	70147	56 142,00	2 807,10

***Шаг аукциона**	Шаг аукциона определяется продавцом в фиксированной сумме, которая не может составлять менее 5 % от начальной цены предмета торгов и не изменяется в течение всего аукциона

Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона

*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона

Порядок ознакомления: в рабочие дня по предварительному согласованию +375 (29) 6139869, Дмитрий

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публич. торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидир. юридич. лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в т. ч. документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения аукциона.

С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации или явки на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене увеличенной на 5 %

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа: ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи – 7 (семь) дней после проведения аукциона

Срок оплаты предмета аукциона: не позднее **10 (десяти) календарных дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **3 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 21.12.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**27.01.2022 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 46, ООО «ИПМ-Консалт оценка»
Дата, время начала и окончания приема заявлений	**с 09.00 14.01.2022 до 17.00 25.01.2022** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 46, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by

Извещение о проведении **26 января 2022 года** повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего УП «Ошмянский дрожжевой завод»

Сведения о продаваемом имуществе

Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества: капитальное строение с инвентарным номером 442/С-9363 общей площадью 136,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, Гудогайский с/с, п. Гудогай, ул. Школьная, 9/2 , наименование – материальный склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инвентарным номером 442/С-9362 общей площадью 155 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, Гудогайский с/с, п. Гудогай, ул. Школьная, 9/1, материальный склад солей, наименование – материальный склад солей, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: ограждение (а), ограждение (б), ворота (в), ворота (г); капитальное строение с инвентарным номером 442/С-9404 общей площадью 16 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, Гудогайский с/с, п. Гудогай, ул. Школьная, 9, наименование – административно-бытовое здание, назначение – здание административно-хозяйственное; котел Е1/9 инв. номер 508, устройство водоочистное ХВО ФС 1015/40МСЕ, инв. номер 511, насос П6-ППВ инв. номер 499, насос Grundfos SQ 3-55 1.15kW, инв. номер 460, лебедка тяговая г/п 2т ЛМ-2, инв. номер 20018, емкость цилиндрическая для хранения мелассы 423,8 куб. м, инв. номер 200127, емкость цилиндрическая для хранения мелассы 423,8 куб. м, инв. номер 200128, емкость цилиндрическая для хранения мелассы 807,1 куб. м, инв. номер 328, емкость цилиндрическая для хранения мелассы 1 723,4 куб. м, инв. номер 329, емкость цилиндрическая для хранения мелассы 1 014 куб. м, инв. номер 273, емкость цилиндрическая для хранения мелассы 1 702,5 куб. м, инв. номер 325, емкость кубическая для слива мелассы инв. номер 413

Сведения о земельном участке: право постоянного пользования на земельный участок площадью 0,3680 га, кадастровый номер – 424681306601000441, целевое назначение земельного участка – для размещения объектов неустановленного назначения (содержания и обслуживания зданий и сооружений)

Начальная цена: 302 000,0 бел. руб. с учетом НДС	**Сумма задатка**: 30 200,0 бел. руб.

Продавец имущества: УП «Ошмянский дрожжевой завод», ул. Борунская, 15, 231103, г. Ошмяны.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего УП «Ошмянский дрожжевой завод», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 26.01.2022.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **26 января 2022 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 17.01.2022 по 24.01.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (044) 533 04 14.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (044) 533 04 14, (1593) 4 51 26 (УП «Ошмянский дрожжевой завод».

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

Утерянные представительством Белгосстраха по Вилейскому району квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии ВА с № 2937870 по № 2937900 **считать недействительными.**

УНП 100122726

БЕДНАЯ КУЦЦЯ

...Не тыя зімы цяпер, ой не тыя — не такія, як некалі: у маленстве, памятаю, з маразамі былі, з глыбокімі снягамі, з мяцеліцамі-вятрамі. У кожнай вёсцы ў кожнай хаце ў гэты час пахнуць завываць, — на печы не ўседзець. Страшна...

Цяпер тыя страхі смешна ўспамінаць — і балюча. «Няма таго, што раньш было». А галоўнае — няма бацькоў, з якімі звязана ўсё...

Тут і цяпер — толькі адзін эпізод, што здарыўся акурат на куццю.

Як сёння помніцца вечар: мы, малыя, расчырванелыя, мокрыя ад снегу, з вуліцы, з горкі разбягаемся па дамах. У чаканні вячэры сядзім з сястрою на печы і назіраем за тым, што робіцца ў кухні. Прысмакі нам рэдка перападалі, аднак на куццю мама заўсёды гатавала нештачка — страву, якую мы елі б хоць кожны дзень! Толькі давайце! І як найхутчэй!

Але ж сёння не к спеху. Тата прыходзіць з вуліцы, кіруе да стала, выцягвае з-за пазухі некалькі пасмаў духмянага сена — акуратна раскладвае яго па стальніцы. Кухня напаўняецца водарам скошаных траў.

Тут жа з'яўляецца мама — кладзе на сена, на стол прыгожы саматкаваны абрус, уносіць посныя стравы. Сярод іх — поліўка з сушаных грыбоў, каша з ячменю, які таўклі ў вялікай ступе... А нарэшце ў цэнтры з'яўляецца міска з любімымі пампушкамі. Іх, маленькія, кругленькія, мама напякала з самага ранку, каб вечарам «утапіць» у місцы з цёртым макам, разбаўленым падсаладжанай вадой. Смаката — проста невыказная!

Убачыўшы яе на стале, мы з сястрой тут жа злазілі з печы. Бацькі садзіліся ад акна, бо адтуль цягнула холадам, мы, дзеці, на ўслончыку насупраць (я — звычка такая — падкурчыўшы ногі).

Елі ўсе з адной міскі. Я старалася роўна трымаць сваю лыжку, але з яе ўсё роўна нешта цякло ці капала — на абрус пралівалася дарожка. Аднак у гэты вечар бацькі нам заўваг не рабілі. Тата хіба жартам казаў, што дзяўчына, якая шмат разлівае, замуж выйдзе за п'яніцу...

Ён наогул мастак быў расказваць — пра ўсё. У тыя імгненні — у паўзмроку пакоя — пра чароўную калядную зорку. Я, вядома ж, хацела ўбачыць яе (фіранкамі на вокнах спецыяльна не завешваліся, каб зазірала яна і ў нашу хаціну), а там...

Словамі не перадаць: нешта лупатае, калматае, з пляскатым носам, з вялізнымі вушамі...

Ад страху, я, мусіць, хацела сігануць, схавацца пад стол — прыгнулася, ілбом зачапіла міску з пампушкамі... Па стале тут жа расцяклася вялізная лужына, што азначала толькі адно: прапала любімая страва! Амаль уся... Мне было так шкада — і яе, і саму сябе, і ўсіх нас (мы ж амаль не паелі!), што я горка заплакала.

...Не ў памяці, чым тады суцяшалі. Помню, што віноватай ва ўсім аказалася суседка. Не прычакаўшы на вячэру свайго чалавека, яна пайшла яго шукаць. У хаты да людзей не заходзіла, каб час не марнаваць (ды і не прынята было — на куццю). Таму яна проста «прыліпала» таварам да шыбы — зазірала ў вокны. Адтуль... Вось мне, малой, і здалося...

Цяпер тое «зданне» ўспамінаецца са светлай усмешкай. Ды і як іначай, калі дзякуючы яму да драбніц помніцца той вечар: наш дом, твары маладых прыгожых бацькоў, стол пад белым даматканым абрусам, святло ад лампадкі з покуці... Бедная — без любімай стравы — куцця.

Галіна Нічыпаровіч,
в. Магільна, Уздзенскі раён.

ДЗЕНЬ ДОБРЫ! І БЫВАЙЦЕ!

У канцы мінулага 2021-га сышла са сваёй нялёгкай пасады першая жанчына-канцлер Федэрацыйнай Рэспублікі Германія Ангела Меркель і тым самым напомніла...

Верасень 2009-га. З курортнага мястэчка Дагебюль я вяртаюся ва ўзгорысты Вуперталь і ўжо там бачу абвестку: 23 верасня ў 17 гадзін адбудзецца перадвыбарны мітынг Хрысціянска-дэмакратычнага саюза, на якім выступіць...

Ажно вочы на лоб: Меркель? Тут, у Вупертале? Няўжо?..

Услед за гэтымі пытаннямі ў галаву прыходзіць цалкам лагічнае: «Дык чаму б не схадзіць, не ўбачыць?!»

...Да 17-ці гадзін час яшчэ заставаўся, таму на сустрэчу я сапраўды пайшоў пехатой — паўз лялечны тэатр, батанічны сад, кірмаш, люстэранскія кіёскі з чырвонай цэглы, невялічкія крамы. І вось нарэшце, непадалёк ад былой сядзібы Энгельса, патрэбная плошча, застаўленая драўлянымі лаўкамі. Перад імі, на ганку ратушы, тры чалавекі наладжваюць мікрафоны. Справа, пад аркай, з тэлекамерамі і «кодакамі» мітусяцца спрытныя журналісты. Злева — стракаты гурт моладзі прыладжвае досыць едкія па змесце плакаты. Плошча запаўняецца людзьмі, іх гоманам, смехам, прывітаннямі-абдымкамі... І раптам гэты натоўп літаральна ўзвывае — з'яўляецца спадарыня Меркель!

Прыціснуты да нейкай стойкі, я не заўважыў, адкуль яна выйшла, але ішла ўпэўнена і рашуча. Напярэдзе чамусьці ні сустракаючых, ні папарацы — хіба некалькі мужчын амаль поруч. Світа ці ахова, шчыра кажучы, не разабраў...

Не ў памяці і тое, як была адзета спадарыня Меркель, што трымала ў руках...

Помню, што ўсміхалася, што прыпынілася каля агароджы, дзе гарлапаніла чародка падлеткаў у аднолькавых кепках, і нешта сказала ім, паціснула рукі...

А натоўп у гэты ж час недзе свістаў, недзе апладзіраваў, досыць зладжана скандзіраваў «Ан-ге-ла! Ан-ге-ла!».

Перакрычаць яго я, вядома ж, не мог, але таксама стараўся, з усяе сілы басіў сваё: «Мер-кель!», «Мер-кель!».

Яна тым часам падыходзіла бліжэй і на сотні працягнутых рук адказвала поціскам сваёй — цёплай (мая чарга!), мяккай, складзенай чаўначком (мабыць, каб нельга было ўхапіцца?).

І вось яна ўжо на ганку ратушы, пачынаецца мітынг...

Трохі пабыўшы там, паглядзеўшы ды паслухаўшы, я пакіраваў да дому, у якім спыніўся, потым — да аэрапорта, да свайго месца ў «Боінгу», што павінен быў прызямліцца ў Барыспалі — бліжэй да роднага мне Палесся.

Анатоль Жогла,
г. п. Лельчыцы.

«ЗАМУЖ ПАВЫХОДЗІЛІ ЎСЕ.

Асобныя — нават двойчы»

Калядная варажба... Не пры нас яна пачалася, не пры нас, дасць бог, і скончыцца. Дзяўчаты, маладзіцы, якім вельмі хочацца замуж, мусіць, заўсёды будуць насіць у хату дровы і потым лічыць, ці парная колькасць паленцаў, з той жа мэтай пойдуць абдымаць штыкеціны ў плоце ды пячы адмысловыя аладкі для сабак: чыю першай ухопяць, тая і замуж пойдзе раней...

Каб жа ведаць, калі гэта будзе? Ну хоць прыблізна... Каб жа ведаць, за каго?

Што можа быць прасцей, — дачакайся вялікіх свят ды паваражы.

...У нашым інтэрнаце (я вучылася ў педвучылішчы ў Магілёве) спосаб быў асаблівы. Кожнай з цікаўных дзяўчат (хлопцаў — вобмаль) мы прапаноўвалі зайсці ў пакой са шклянкай вады, сесці перад люстэркам, завязаць вочы. А далей — абмакнуўшы палец у вадкасць (у шклянку з вадой крадком дадаваліся акварэльныя фарбы), вадзіць ім па адкрытых участках твару ды ўзірацца-чакаць — перад вачыма павінен з'явіцца нарачоны.

Што цікава — хто-ніхто бачыў! Спачатку яго, потым сябе — у люстэрку...

У той год такі спосаб варажбы я прывезла ў нашу вёску, у нашу хату, і ўсе дзяўчаты, якія там сабраліся, ужо «даведаліся» пра свой будучы лёс, паглядзеліся ў люстэрка, ужо нарагаталіся і нават адмыліся (для гэтага ў сенцах на керагазе грэлася вада, стаяў тазік, ляжала мыла і вісеў ручнік)... І тут дзверы адчыніліся, у хату зайшла цётачка Ганна. Мая сяброўка Валя тут жа да яе:

— Мама, ты таксама паваражы. Табе ж цыганка сказала, што з маім татам (маці ў Валі была не родная) ты свой век дажываць не будзеш. Дык цікава ж, з кім?

Жанчыну, як выглядала, тое зусім не цікавіла, але нас, дзяўчат, было многа, мы стараліся і... угаварылі. Цётачка села перад люстэркам, дала завязаць сабе вочы, падсіненым пальцам стала добрасумленна вадзіць па шчоках, падбароддзі і носе.

Тата мой таксама быў дома, таксама назіраў: адклаў убок чытаную кніжку, спытаў:

— Ну што ты маўчыш? Кажы, каго там бачыш? Юрку? Ці не?

— Ды нікога не бачу! — абурылася Ганна.

...Калі «жывога месца» на тварах больш не засталося, павязку з цётачкі зняли.

Рогату было на ўсю хату! А потым і гутаркі на ўсю вёску! Аднак цётка не крыўдавала. Добрая была жанчына, любіла і дзяцей наогул, і Валю (хоць не сваю)... Вяселле ёй справіла...

Што датычыцца іншых дзяўчат, то яны таксама замуж павыходзілі. Асобныя — нават двойчы.

Алена Панцялеева,
Нясвіжскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж.

Як вы зразумелі, гэта была першая падборка «вясёлых і праўдзівых гісторый», дасланых чытачамі на даўно традыцыйны «звяздоўскі» конкурс.

Вынікі леташняга — на найлепшую — пакуль падводзяцца і будуць абвешчаны ў хуткім часе. А пакуль заўсёдае: чытайце адзіную са штодзённых беларускамоўную газету і пішыце. Свет захаваўся таму, што смяяўся. І думаў.

Неасабісты суб'ектыў

Стары Новы год

На тое і свята — каб адзначаць

У тым, што выключна наша свята — Стары Новы год — прыводзіць іншаземцаў у літаральны ступар, даводзілася пераконвацца неаднойчы: так бы мовіць, на свае вочы. Зрэшты, іншаземцы — гэта так, дарэчы прыйшлося. Гісторыя, якую хачу расказаць, самая што ні ёсць айчынная, з месцам дзеі ў нашай слаўнай сталіцы. Мы тады ў цёплай дзявочай кампаніі на кухні маёй новай кватэры Стары Новы год і вырашылі адзначыць. Прычым адпаведна з сапраўднай навагодняй традыцыяй: вырашылі дачакацца бою гадзінніка (яго ролю выконваў стары будзільнік у металічным корпусе, заведзены на поўнач) і пад яго адкаркаваць бутэльку шампанскага. Яна засталася з тых прыпасаў, што рабіліся загадзя, і стаяла ў халадзільніку, мусіць, з кастрычніка. Шампанскае было звычайнае «Савецкае», з белым пластыкавым коркам, які, калі памятаеце, вылятаў з хуткасцю кулі і абавязкова трапляў калі не камусьці з гасцей у вока, дык у столь ці ў люстру.... Карацей, у дванаццаць гадзін будзільнік забарабаніў з усяе свае жалезнае сілы, дзяўчаты пазажмурваліся і адхінуліся, я ўзялася за тую бутэльку, акуратна зняла драцяную аплётку, таксама зажмурылася, пацягнула корак, і... нічога не адбылося. У сэнсе — корак застаўся на месцы, ён не тое што не вылецеў — ён не выцягваўся!

Першыя хвілін дваццаць Старога Новага года тройка маладых сімпатычных дзяўчат змагалася з той няшчаснай бутэлькай, якая ці то перастаяла ў халодным месцы, ці проста была бракаваная. Збоку відовішча, напэўна, было ну вельмі смешнае, але нам было не да смеху. Нарэшце дайшло да таго, што цягнулі той корак літаральна абцугамі — гэты карысны інструмент знайшоўся ў гаспадыні ў скрынцы пад ваннай. Не тое што хацелася выпіць — нам і без таго было хораша і весела, але ж гэта была справа прынцыпу! Здавацца мы не збіраліся. Нарэшце думкі разышліся. Асабліва адчайныя прапаноўвалі адбіць горла ўзмахам нажа, як тое бачылі ў нейкім кіно. «Партыя кансерватараў» схілялася да ідэі пазваніць у дзверы суседу — суровому халасцяку, выбачыцца і папрасіць дапамагчы. І тая, і тая ідэя былі досыць рызыкоўнымі, таму хтосьці з нас роспачна выдыхнуў: «Божа, пашлі хоць якога лядашчага мужчынку!»

І хвіліны праз дзве (вы не паверыце!) зазваніў дамафон. «Леначка, гэта я! Даруй, каханая, што спазніўся!», — мужчынскі голас быў такі змерзлы ды роспачны, што я аўтаматычна націснула на кнопку адкрывання дзвярэй пад'езда. І толькі потым да мяне дайшло: я ж нікога не запрашала! А ён ужо званіў у кватэру — сапраўды «лядашчы» — немалады, невысокі, запыханы і збянтэжаны, з вялізным букетам руж, з бутэлькай шампанскага (таксама «Савецкага») у руках, з пачкам цукерак пад пахай. «Добры вечар. А дзе Лена?» — ветліва спытаўся ў вашай пакорнай слугі. «Вы, напэўна, не туды трапілі». «Як не туды? — мітусліва дастаў паперку з кішэні кажушка, стаў чытаць: — Вуліца Чыгладзэ, дом...» «Не Чыгладзэ, а Чайлытки...» Мужчынка здзіўлена палыпаў вачамі і зніякавела сеў прама на парозе: «Во прыехаў!».

Ён быў у такім шоку і непадробнай роспачы, што мы ледзь угаварылі яго прайсці ў дом і расказаць, у чым справа. Аказалася, Яўген ехаў на Стары Новы год да сваёй каханай жанчыны, Алены. Яны пазнаёміліся восенню ў санаторыі. Ён удавец, яна разведзеная, дзеці ў абаіх ужо выраслі. Адносіны ў іх былі самыя сур'ёзныя: Новы год яны сустрэлі ў яго ў Паставах, а на Стары Новы год яна ўпершыню запрасіла яго да сябе ў Мінск. Ехаў ён з самымі высакароднымі намерамі — рабіць прапанову, нават пярсцёнак купіў. Але ў дарозе зламаўся аўтобус, і на вакзал замест сямі гадзін ён трапіў а палове дванаццатай. Пазваніў каханай, крыкнуў «ужо імчу», перапытаў яшчэ раз нумар дома і кватэры, каб не забыцца. Злавіў таксі, у спешцы не мог знайсці паперку з адрасам, што была ў кішэні. Падумаў, што згубіў, але не бяда — нумар дома і кватэры памятаў, а вось вуліца... Удакладняць у гаспадыні пасаромеўся, памятаў, што на літару «Ч». «Мо Чайлыткі?» — падказаў таксіст. Чалавеку, які ў Мінску не жыве і рэдка бывае, назва падалася вельмі падобнай да «арыгінала», таму ён сказаў везці яго туды. А тут яшчэ ў кватэры з тым жа нумарам гаспадыня цёзкай яго дамы аказалася...

